Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

64 (5738) | 18 сакавіка 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Таварыш Шаранговіч В. Ф. абран першым сакратаром і членам бюро ЦК КП(б)Б.

Аб выніках Пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) — Рэзалюцыя схода актыва маскоўскай арганізацыі ВКП(б) па дакладу тав. Хрушчова.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Не стрымліваць, а развіваць трэба самакрытыку.

Г. Гейлер — Парыжская Комуна.

М. Ляўкоў — Дзень МОПР.

Бутомаў — Тэрор не зломіць мужнасць рэвалюцыянераў.

Н. Гасман — Пачуццё пролетарскага інтэрнацыяналізма.

М. Ваганава — Гарком комсамола адарваны ад сапраўднага жыцця.

Н. Вішнеўскі — Сям'я непраўцаў.

За рубяжом:

Фашысцкая правакацыя ў Парыжы.

Рэспубліканцы Іспаніі захапілі багатую ваенную здабычу.

Заява Альвараса дэль-Вайо.

Вялікі антыфашысцкі мітынг у Нью-Ёрку.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

Пленум ЦК КП(б)Б абраў першым сакратаром і членам бюро ЦК КП(б)Б члена ЦК КП(б)Б тав. **Шаранговіча В. Ф.**

НЕ СТРЫМЛІВАЦЬ, А РАЗВІВАЦЬ ТРЭБА САМАКРЫТЫКУ

Рэзалюцыя пленума ЦК ВКП(б) і дакład тав. Жданава з выключнай увагай вывучаюцца членамі КП(б)Б. Гэтыя дакументы становяцца настольнай кнігай і дапамогай нашай практыкі. Комуністы, узброеныя гэтымі дакументамі, ускрываюць слабыя недахопы практыкі партыйнай работы. Многія кіраўнікі гарадзкіх і раённых партыйных арганізацый сталі на чале паўшагася развароту большэвіцкай самакрытыкі. Аднак, ёсць і такія кіраўнікі, якія не жадаюць падымаць самакрытыку, абмяжоўваюць увесці яе ў рамкі. Вось, напрыклад, у Талачынскім раёне на агульным сходзе абмяркоўваюцца вынікі лютаўскіх спраў. На гэтым сходзе выступае комуніст Буз з крытыкай работы старшыні райсавета. Тав. Вайсбард, сакратар райкома, на другі-ж дзень выклікаў Буза ў райком, каб даць яму «ўрок», а фактычна некалькі дзён паставіў пытанне на бюро райкома партыі. Выклік гэты з'яўляецца фактам грубага запіску самакрытыкі. Каб правесці поўнасцю і да канца рашэнні пленума ЦК ВКП(б), неабходна ісці па руках такім і падобным глушыцелям самакрытыкі, якія прабуюць звязаць ініцыятыву партыйных мас, жадаючых скарыстаць сваё законнае права кантролю над кіруючымі партыйнымі органамі.

У рабоце КП(б)Б многа буйных недахопаў і промахаў. Іх трэба рашуча ўскрываць і выпраўляць. Толькі ў гэтым выпадку КП(б)Б можа стаць на чале паваротаў, які адбыўся ў краіне ў сувязі з прыняццем Сталінскай Канстытуцыі.

БССР мяжуе з капіталістычным светам. Праз нашу тэрыторыю ў другія рэспублікі Саюза фашысты перасылаюць сваіх агентаў. На тэрыторыі БССР асела і асядае нямала ворагаў сацыялізма. Полныя агенты Трацкага шкодзілі нам на такіх участках сацыялістычнага будаўніцтва, як перш за ўсё залежыць абаронная магутнасць рэспублікі і Саюза ССР. Шкодзілі яны і шкодзяць яшчэ нам і ў харчовай прамысловасці, і на сельскагаспадарчым участку сацыялістычнага будаўніцтва. Астаецца фактам, што гэту подлую дзейнасць партыйныя арганізацыі не заўважылі. Трэба ад канца ўскрыць прычыны гэтага факта. Разгортванне большэвіцкай самакрытыкі дапаможа нам раскрыць сапраўдныя прычыны гэтага з'явішча, ускрые практыку, якая не давала магчымасці выкрыць ворага. Вось чаму большэвіцкую самакрытыку, якая ў партарганізацыях пачала разгортвацца, трэба ўсямерна падтрымліваць, а не згортваць.

Таварыш Сталін і ЦК ВКП(б) не раз паказалі нам узоры большэвіцкай самакрытыкі. Нядаўна скончыўшійся Пленум ЦК ВКП(б) прайшоў пад знакам большэвіцкай самакрытыкі. Пленум ускрыў буйнейшыя недахопы ў рабоце Азова-Чорнаморскага края і Кіеўскай вобласці, падкрэсліўшы, што гэтыя недахопы ў той ці іншай меры ўласцівы ўсім партарганізацыям.

У чым прычына іх? Яна ляжыць у небольшэвіцкай практыцы работы. Такая практыка была і ёсць яшчэ ў КП(б)Б. Аддзелы ЦК КП(б)Б, у асабліваści сельскагаспадарчы і прамысловы, захапіліся гаспадарчай работай, забыўшы аб партыйнай рабоце. Па іх шляху пайшлі акругкомы і райкомы. Дзякуючы гэтаму партыйная арганізацыя не папярэдзіла парушэнне законаў совецкай улады мясцовымі работнікамі, даўшы разрасціся гэтым парушэнням да злачынных размераў, як гэта было ў Лепелі. Совет Народных Камісараў, маючы сігналы (парушэнні ў Суражскім раёне, гл. «Звязду» № 57) аб парушэннях рэвалюцыйнай законнасці, не надаў ім значэння. Кіраўніцтва справамі і кансультант Соўнаркома, да якога трапіў сігнал, правялі ў гэтай справе яўную палітычную слепату.

Аддзелы ЦК КП(б)Б, а следам за імі і акругкомы захапіліся гаспадарчымі пытаннямі вёскі, забыўшы горад. КП(б)Б парушыла большэвіцкую традыцыю і перанесла базу сваёй работы з горада ў вёску, няправільна разглядаючы работу ў горадзе, як другарадны ўчастак.

У КП(б)Б парушаўся статут партыі. Ва многіх партыйных арганізацыях быў парушан прынцып выбарнасці і падменен кааптацыяй, выбарнасць сакратароў первічных партыйных арганізацый была падменена ў радзе выпадкаў назначэнствам. Аб гэтых парушэннях сігналізаваў ЦК КП(б)Б упаўнаважаны Камісіі партыйнага кантроля, але аддзел парторганаў не рэагаваў на гэтыя сігналы па-большэвіцку, не надаваў ім значэння. У выніку ўсёй гэтай практыкі тармозіўся рост актыўнасці партыйных мас, самакрытыка ў належнай мэры не развівалася, узброенасць і пільнасць комуністаў аслабляліся.

Вораг выкарыстаў гэта і пранік не толькі на вытворчасць, але ў совецкі і партыйны апарат.

У цэнтральным органе КП(б)Б «Звязде», на вачах у партыйнай арганізацыі доўгі час падвізаўся трацкіст-тэрарыст Розенблюм, у апараце Соўнаркома працаваў трацкіст Галенда, а ў апараце ЦК КП(б)Б — трацкіст Міжкін. Подлая банда трацкістаў, нацдэмаў і правых насаджала сваіх агентаў і ў раёнах. Натуральна, што калі-б пільнасць была падняята, калі-б комуністы былі ўзброены, калі-б партыйны статут не парушаўся, гэтай подлай банде не толькі не ўдалося-б столькі часу сядзець у апараце, але можа быць нават і пралезці ў яго.

Подлыя прахвосты трымаліся і могілі магчымасць трымацца доўгі час яшчэ і таму, што яны культывавалі падхалімства, якому комуністы ў належнай меры не прыпісвалі. Партыйцы, прызваныя выкрыць гэты манеўр ворага, самі садзейнічалі гэтаму, расхвальваючы па ўсе лады аказных рэспубліканскіх і раённых работнікаў. Вялікая доля віны ў гэтым ляжыць і на газеце «Звязда», закліканай у першую чаргу выкрываць гэты варожы манеўр. «Звязда» бачыла разгул падхалімства на старонках раённых газет і не змагалася супроць яго. У перадавым артыкуле ад 8 лютага 1937 года «Звязда», тлумачачы карэнні падхалімства, дапусціла грубую палітычную памылку. Яна пісала тады: «Панясен сур'ёзны ўдар расхлябанасці і падхалімству, народжаным сцепыфічнымі ўмовамі жыцця беларускага і яўрэйскага народу ў мінулым, местачковасцю». У сапраўднасці, беларускі і яўрэйскі народ заўсёды быў ворагам падхалімства, інакш ён не мог-бы перамагчы памешчыкаў і капіталістаў, не мог-бы ліквідаваць кулацтва і пабудаваць сацыялізм. Падхалімства зараз насаджаецца ворагам. І «Звязда», у прыватнасці, амаль яшчэ нічога не зрабіла для выкрыцця яго. Падхалімства можна і неабходна выкарчаваць агнём большэвіцкай самакрытыкі, апіраючыся на рэвалюцыйныя традыцыі беларускага і яўрэйскага народу.

Падхалімства культывуецца ў радзе наркаматаў БССР. Комуністы павінны ўзначаліць барацьбу з падхалімствам, выганяючы брудную мятлой з апарата падхалімаў і падхалімствуючых.

Вышэй трэба ўзнімаць сцяг самакрытыкі, смялей трэба выкрываць недахопы ў рабоце, незалежна ад таго, якія асобы і ўстановы вінаўны ў іх.

У нашай краіне, дзе перамог сацыялізм, краіне, якая хутка прыступіць да самых дэмакратычных у свеце выбараў у Вярхоўны Совет, народнае давер'е можна заваяваць не ілжывым аўтарытэтам, не парадным шуміхай, а сапраўднай работай. Большэвіцкая самакрытыка, яе разгортванне, ускрыццё ўсіх недахопаў нашай работы выганяць небольшэвіцкую практыку ў рабоце, ператворыць кожнага комуніста ў аўтарытэтнага, карыстаючагася народным давер'ем, баявога кіраўніка прапоўных мас. Большэвіцкая самакрытыка ўзброіць кожнага комуніста ў барацьбе з ворагам, які ўзмоцнена рыхтуецца да выбараў, павысіць актыўнасць членаў КП(б)Б. Вось чаму не стрымліваць, а развіваць трэба самакрытыку вось чаму самакрытыка нам патрэбна, не зважаючы на асобы.

Аб выніках Пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

Рэзалюцыя схода актыва маскоўскай арганізацыі ВКП(б) па дакладу тав. ХРУШЧОВА

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад тав. Хрушчова аб выніках чарговага Пленума ЦК ВКП(б), сход партыйнага актыва маскоўскай арганізацыі ў колькасці больш 2 тыс. чалавек цалкам ухваляе рашэнні Пленума і патрабуе ад партыйных арганізацый, партыйных кіраўнікоў і ад кожнага комуніста няўхільнага правядзення іх у жыццё.

Партыйныя арганізацыі павінны ва ўсеўзбраенні сустрэць паварот у палітычным жыцці краіны, звязаны з увядзеннем Сталінскай Канстытуцыі. Для гэтага, як указаў Пленум ЦК ВКП(б), партыйныя арганізацыі самі павінны праводзіць паслядоўна дэмакратычную практыку, павінны праводзіць да канца ва ўнутрыпартыйным жыцці асновы дэмакратычнага цэнтралізма, забяспечыць карэнную перабудову ўсёй партыйна-палітычнай работы.

Пленум ЦК з усёй рэзкасцю ўскрыў і асудзіў недахопы партыйнай работы, карыстаючыся якімі ворагі партыі, агенты фашызма зможалі пранікнуць не толькі ў гаспадарчыя органы, але і ў нашы партыйныя арганізацыі, і весці там падрыўную работу.

Гэтыя недахопы заключаюцца перш за ўсё, ў тым, што частка партыйных кіраўнікоў, захапіўшыся гаспадарчымі поспехамі, стала паступова адыходзіць ад партыйна-палітычнай работы, трапіць густ да прапаганды маркізма-ленінізма, да палітычнага выхавання мас, стала згортваць крытыку нашых недахопаў і самакрытыку, стала адыходзіць ад прамой адказнасці перад партыйнымі масамі, стала адрывацца ад мас і парушаць выбарнасць парторганаў, прадугледжаную статутам партыі.

Партыйныя арганізацыі і партыйныя кіраўнікі не зрабілі ўсіх вываадаў з неаднаразовых папярэджанняў і ўказанняў Цэнтральнага Камітэта аб неабходнасці павышэння рэвалюцыйнай пільнасці, аб тым, што чым сур'ёзней нашы поспехі, тым больш шалёным становіцца вораг, тым больш вострым становіцца яго супраціўленне.

Многія партыйныя кіраўнікі забыліся, што СССР знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, што буржуазія безупынна засылае і будзе засылаць да нас сваіх шпіёнаў і дыверсантаў, праглядзелі, што трацкізм ужо даўно перастаў быць палітычнай плынню ў рабочым руху, што трацкісты з'яўляюцца знаходкай для капіталістычных краін у фарміраванні імі ўсякіх антысавецкіх дыверсанцкіх і шпіёнскіх банд.

Сход маскоўскага партыйнага актыва рашучым чынам асуджае парушэнне асноў унутрыпартыйнай дэмакратыі, прадпісваемых статутам партыі. Большасць райкомаў і первічных партыйных арганізацый Масквы і Маскоўскай вобласці не ачытвалася звыш трох гадоў перад партыйнымі масамі, іх абраўшымі, і дапусцілі зусім недапушчальную практыку каптацыі ў кіруючыя партыйныя органы (каптавана 17 прац. складу райкомаў вобласці). Гэта гаворыць аб адыходзе кіраўнікоў партыйных органаў ад кантролю, ад адказнасці перад партыйнымі масамі.

Сход актыва лічыць зусім недапушчальным такое становішча, калі ў радзе партыйных арганізацый Масквы і вобласці партыйныя сходы і пленумы райкомаў ператварыліся з арэны большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі ў арэну бясконцых парадаў, шумлівых рапортаў аб поспехах, нікому не патрэбных прывітанняў па адрасу кіраўнікоў партыі.

Сход актыва адзначае, што пленумы раённых камітэтаў збіраюцца вельмі рэдка, мала абмяркоўваюць канкрэтныя пытанні партыйнай работы, справаздачы бюро райкомаў і первічных партарганізацый.

Сход адзначае таксама, што рэдка збіраліся пленумы Маскоўскага гарадзкога і абласнога камітэтаў ВКП(б).

Сход актыва лічыць зусім недапушчальным, што многія партыйныя кіраўнікі не выканалі ўказанняў Цэнтральнага Камітэта партыі аб выпраўленні памылак, дапушчаных у маскоўскай партыйнай арганізацыі у адносінах выключаных з партыі ў часе праверкі і абмену партыйных дакументаў па матывах пасіўнасці і малазначных учынках. Гэта асабліва адносіцца да Дзержынскага, чыгуначнага, Молатаўскага, Свердлоўскага райкомаў т. Масквы, Каломенскага райкома вобласці, якія пры праверцы і абмене партыйных дакументаў не заўважылі і не выкрылі ворагаў партыі—трацкістаў і правых, выдалі ім новыя партыйныя білеты, праявіўшы ў той жа час бяздушныя адносіны да чэсных комуністаў, выключыўшы многіх з іх за так званую «пасіўнасць» і малаважныя ўчынкі. Сход актыва ўхваляе рашэнні Камісіі Партыйнага Кантроля пры ЦК ВКП(б) аб налажэнні партыйнага спагнання на першага сакратара Дзержынскага райкома т. Перчык і першага сакратара Растокінскага райкома т. Сімакова.

Сход актыва адзначае недавальняючую пастаноўку прапаганды марксізма-ленінізма, палітычнай агітацыі і кіраўніцтва друкам у маскоўскай партыйнай арганізацыі. Асабліва дрэнна пастаўлена гэта работа ў райкомах: Краснагвардзейскім, Сакольніцкім, Таганскім, Першамайскім, Фрунзенскім, дзе сакратары перадаверылі кіраўніцтва прапагандай і друкам другаразнім работнікам апарата і не дапамагалі ім у іх рабоце.

Сход актыва патрабуе ад партыйных арганізацый, ад партыйных і гаспадарчых кіраўнікоў зрабіць усе вывады з урокаў шкодніцтва, дыверсій і шпіянажа япона-нямецка-трацкісцкіх агентаў і іх правых саўдзельнікаў, нанесшых немалую шкоду прамысловасці і транспарту. Большэвікі павінны ўсвоіць да канца, як гэта патрабуе Цэнтральны Камітэт нашай партыі, задачу авалодання большэвізмам. Лозунг «Большэвікі павінны авалодаць тэхнікай» павінен быць цяпер дапоўнен лозунгам аб аўладанні большэвізмам.

Выбары партыйных органаў на аснове зачынятага (тайнага) галасавання канцылятаў павінны быць праведзены пад знакам большэвіцкай самакрытыкі, ліквідацыі ўсіх недахопаў у партыйнай рабоце, кожнай партарганізацыі, мабілізацыі пільнасці комуністаў і іх актыўнасці. Такое правядзенне выбараў узніме адказнасць кожнага кіраўніка перад партыйнымі масамі, ударыць па элементах сямейнасці, групаўшчыны і будзе садзейнічаць вылучэнню здольных, лепшых, адданых партыі і яе Цэнтральнаму Камітэту большэвікоў.

Сход актыва лічыць партыйным абавязкам кожнага кіраўніка, кожнай партарганізацыі глыбока вывучыць рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), разгарнуць чесную рэвалюцыйную самакрытыку, па-большэвіцку ажыццяўляць падбор партыйных кадраў і паставіць на належную вышыню марксісцка-ленінскае выхаванне іх, зрабіць праверку выканання сістэмай сваёй работы, з усёй настойлівасцю змагацца за ліквідацыю недахопаў партыйнай работы, перабудаваць партыйна-палітычную работу ў поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі Пленума Цэнтральнага Камітэта партыі.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта партыі наша краіна атрымала рашаючыя перамогі ў барацьбе за комунізм і пабудавала сацыялістычнае грамадства.

Пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта партыі—наперад да новых перамог комунізма!

***

Сход актыва ўхваляе рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) аб выключэнні Бухарына і Рыкава з радоў ВКП(б) за антыпартыйную, здрадніцкую дзейнасць, накіраваную на знішчэнне сацыялістычных завалёў рабочых і сялян і на аднаўленне капіталізма.

ПЕРШЫ САКРАТАР ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ ВАСІЛІЙ ФАМІЧ

Тав. Шаранговіч Васілій Фаміч вядомы беларускім рабочым і сялянам, як работнік партыйнага падполля ў гады польскай і нямецкай акупацый і кіраўнік партызанскіх атрадаў. За баявыя заслугі ён узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга і ганаровай зброяй.

Тав. Шаранговіч — беларус. У партыю уступіў у 1917 годзе. Пасля грамадзянскай вайны вёў кіруючую профсаюзную работу ў Сібіры і Беларусі. У 1930 годзе ён быў абран другім сакратаром ЦК КП(б)Б. На XVII з'ездзе партыі тав. Шаранговіч быў абран членам КПК і як упаўнаважаны КПК працаваў у 1934 — 35 годзе у Казахстане, а апошні год у Харкаўскай вобласці.

Дзень Парыжскай Комуны

66 год прайшло з таго дня, калі рабочыя Парыжа ўзнялі сцяг пролетарскага паўстання, узяўшы ўладу ў свае рукі. Упершыню ў гісторыі чалавецтва ўлада была вырвана з рук буржуазіі і створан урад эксплуатуемых—Парыжская комуна.

72 дні праіснавала Парыжская комуна. 72 дні над Парыжам развіваўся чырвоны сцяг. 72 дні ішла пяроўная барацьба паміж рэвалюцыйным Парыжам і контрэвалюцыйным версальскім урадам, урадам крывяжэрнага Т'ера і прадажнага міністра Фаўра. Комунары і комунаркі праяўлялі цуды гераізма, змагаючыся на барыкадах да апошняй кроплі крыві. Але няроўнасць сіл—асаджэнне Парыжа версальцамі, прускай 100-тысячнай арміяй, наяўнасць перавагі ўзброеных сіл на баку версальцаў — зрабіла сваю справу. 21 мая 1871 года ў Парыж уварваліся версальцы, а 28 мая Комуна была канчаткова падаўлена. Па прыказу гэтага тыдня рэвалюцыйны Парыж страціў больш 100 тыс. чалавек, з іх больш 30 тыс. комунараў забіта, 45 тыс. арыштавана.

У патоках крыві затапіла буржуазія Парыжскую комуну. Горамі трупаў былі завалены рабочыя ваколіцы Парыжа. На разварочаным бруку, на залітых крывёю барыкадах, пад гукі выстралаў на могілках Пер-Ля-Шэз, дзе тысячамі расстрэльваліся парыжскія комунары, буржуазія святкавала сваю перамогу.

Парыжская комуна загінула. Але справа, за якую змагаўся парыжскі пролетарыят, асталася жыць. Урокі Парыжскай комуны, вопыт барацьбы, яе памылкі былі старанна вывучаны і ўлічаны вялікімі настаўнікамі і правадырамі сусветнага пролетарыята Марксам—Энгельсам—Леніным—Сталіным.

Пролетарыят Расіі глыбока і ўважліва вывучаў урокі барацьбы парыжскіх комунараў. Ён стварыў сваю адзіную рэвалюцыйную партыю, партыю большэвікоў, арганізаваную вялікімі правадырамі Леніным і Сталіным. Партыя Леніна—Сталіна дала рабочаму класу дакладную і ясную праграму барацьбы за комунізм. Яна крапатліва і ўпарта выхоўвала рабочы клас у рэвалюцыйным духу, выкрываючы здрадніцкую ролю меншавікоў, эсераў, трацкістаў і т. д. Самаадданае кіраўніцтва партыі Леніна—Сталіна забяспечыла перамогу Вялікай пролетарскай рэвалюцыі ў Расіі. Пад кіраўніцтвам партыі рабочы клас атрымаў перамогу на шматлікіх франтах грамадзянскай вайны. Пад кіраўніцтвам партыі і вялікага Сталіна многанацыянальны народ Совецкага Саюза пабудаваў сацыялістычнае грамадства.

Сацыялізм стаў фактам. Грандыёзныя дасягненні, здабытыя ў гераічнай барацьбе, запісаны ў Сталінскай Канстытуцыі—гэтай хартыі свабод вызваленага чалавецтва. Самыя адважныя мары сацень пакаленняў, мары лепшых людзей усіх пакаленняў і народаў ажыццёўлены і ператвораны ў рэчаіснасць у нашай выдатнай сацыялістычнай краіне — у бацькаўшчыне пролетарыята ўсяго свету. Як яркі маяк ззяе краіна Совецкаў, паказваючы прыгнечаным і пазбаўленым усяго свету адзіны правільны шлях барацьбы за вызваленне, адзіны правільны выхад з цемры і хаоса фашызма, з бяздоння жабрацтва і пакут народных мас.

Фашызм старанна рыхтуе новую вайну супроць нашай краіны — сацыялістычнай бацькаўшчыны міжнароднага пролетарыята. Рыхтуючы ваенны напад на СССР, фашызм пасылае банды старанна маскуючыхся трацкісцка-зіноўеўскіх дыверсантаў, шпіёнаў, шкоднікаў, тэрарыстаў для падрыву магутнасці нашай сацыялістычнай радзімы. Яны марачь аб тым, каб квітнеючую краіну сацыялізма ператварыць у калонію германскіх фашыстаў і японскіх імперыялістаў.

Сёння, калі ўвесь сусветны пролетарыят схіляе свае галовы перад магілай паўшых комунараў і афіар сучасных канібалаў, сэрцы прапоўных усяго свету яшчэ больш напаўняюцца глыбокай нянавісцю да фашысцкіх катаў і забойцаў.

Прапоўныя нашай сацыялістычнай радзімы, выхаваныя партыяй Леніна — Сталіна ў духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, паказваюць прыклад міжнароднай салідарнасці прапоўным усяго свету. Барацьба іспанскага народу, барацьба прапоўных усяго капіталістычнага свету знаходзіць гарачы водгук і спачуванне ў сэрцах прапоўных нашай краіны. Гэта велізарная ніцасць да таго, што робіцца за рубяжом, да гераічнай барацьбы прыгнечанага чалавецтва ў капіталістычных краінах, жаданне дапамагчы сваім братам па класу ў іх барацьбе, знайшло сваё яркае выражэнне і ў тым, што больш 9 мільёнаў прапоўных нашай краіны з'яўляюцца членамі МОПР'а. За 14 год існавання МОПР'а прапоўныя Совецкага Саюза сабралі звыш 80 мільёнаў рублёў для дапамогі афярам фашызма. Прапоўныя нашай краіны на сваіх спітках запісалі: «Кожную галізну нашага жыцця кожную кроплю нашай крыві аддадзім за вызваленне ўсіх прапоўных ад ганебнага фашысцкага рэжыма» (Дзімітраў).

У дзень 66-й гадавіны Парыжскай комуны і 14-й гадавіны МОПР'а, агаляючы галовы перад магілай герояў Парыжскай комуны, успамінаючы аб усіх афярах, паўшых у барацьбе з рэакцыяй і крывавым фашызмам, прапоўныя Беларусі, як і прапоўныя ўсёй нашай краіны, у свядомасці свайго інтэрнацыянальнага абавязку яшчэ больш узнімуць большэвіцкую пільнасць, яшчэ больш будуць пранікаць над уманаванням абароназдольнасці краіны сацыялізма, яшчэ больш будуць мацаваць сувязі міжнароднай салідарнасці, яшчэ вышай узнімуць сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма — вялікі непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

СХОД АКТЫВА ЦЭНТРАЛЬНЫХ КІРАЎНІЦТВАЎ НАРОДНАГА КАМІСАРЫЯТА АБАРОНЫ СССР І ВАЕННЫХ АКАДЭМІЯЎ РСЧА

З 13 па 15 сакавіка ў Калонным зале Дома саюзаў адбываўся сход актыва партыйных і непартыйных большэвікоў цэнтральных кіраўніцтваў Народнага камісарыята абароны СССР і маскоўскіх ваенных акадэмій РСЧА. На актыве прысутнічала каля 2 тысяч камандзіраў, палітработнікаў, інжынераў, інтэндантаў, дактароў і інш.

З дакладам аб рашэннях чарговага пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) выступіў народны камісар абароны тав. К. Е. **Варашылаў.**

Па дакладу тав. **Варашылава** разгарнуліся надзвычай жвавыя спрэчкі. Выступаўшыя таварышы па-большэвіцку ўскрывалі недахопы сваёй работы і работы цэнтральных кіраўніцтваў наркамата абароны, узялі гэтыя недахопы пад рэзкую крытыку, прычым было прапанавана шмат практычных мер для іх знішчэння.

З запісаўшыхся ў спрэчках 160 чалавек выказалася 56.

Сход аднагалосна прыняў наступную рэзалюцыю:

«Актыў Народнага камісарыята абароны Саюза ССР, заслухаўшы даклад тав. **Варашылава** аб пленуме Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), цалкам і поўнасцю ўхвалае і вітае гістарычныя рашэнні пленума ЦК ВКП(б).

Актыў абавязваецца перад ЦК ВКП(б) і правадыром партыі таварышам **Сталіным** прыкласці ўсе свае сілы, каб па-большэвіцку, чэсна і добрасумленна правесці ў жыццё гэтыя рашэнні і ўзняць яшчэ вышэй баявую і палітычную падрыхтоўку Рабоча-Сялянскай Ныр вонай Арміі, забяспечыўшы яе пастаянную пераможную боегатоўнасць».

У'СНК БССР

КАНТРАКТАЦЫЯ ВЫСОКАГАТУНКОВАЙ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ

Соўнарком БССР зацвердзіў план кантрактацыі высокагатунковага ільнавалакна (№ 26 і вышэй) і ільняной трасты (№ 4 і вышэй).

Наркамзему, акруговым і раённым выканаўчым камітэтам тых раёнаў, у якіх будзе праводзіцца кантрактацыя высокаякаснага ільну, даручана правесці ў натуры адбор і вызяўленне добразапрацаваных в восені і ўгноеных участкаў пад лён у лепшых калгасах і ў першую чаргу ў калгасах, атрымаўшых у 1936 г. высокапумарнае ільнавалакно.

Соўнарком зацвердзіў план (мінімальны) адбору ўчасткаў у калгасах пад высокаякасны лён у колькасці 1.380 гектараў. У мэтах стымулявання барацьбы калгаснікаў за высокаякасны лён СНК павысіў загатоўчыя цэны на высокагатунковую ільнатрасту.

Соўнарком абавязаў Наркамзем забяспечыць усе калгасы, якія ўзялі на сябе абавязацельствы па здачы валакна № 26 і вышэй і трасты № 4, насеннем селекцыйнага ільну ў колькасці, патрэбнай для абсемянення вызеленых участкаў. Наркамзему даручана да 25 сакавіка выдаць масавым тыражом інструкцыю для калгасаў па атрыманню высокапумарнага ільнавалакна і трасты (БЕЛТА).

ТЭРОР НЕ ЗЛОМІЦЬ МУЖНАСЦЬ РЭВОЛЮЦЫЯНЕРАЎ

У выгонага совецкага мастака Барыса Ефімава ёсць такі выдатны малюнак:

З сталёвай каскі штурмавіка выглядаюць тур'і рогі. На касцы — эмблема фашызма. З-пад яе глядзяць на вас налітыя крывёю вочы, гнусная, злобная морда двуногага звера. Ён абапіраецца на сякіру ката і германскую вінтоўку. Гэта знарыны твар фашызма — лютага ворага народаў, падпальшчыка вайны. Гэта твар дастойнага наследніка версальскіх катаў, якія 66 год таму назад па-зверску расправіліся з героямі парыжскіх барыкад, з барацьбітамі Парыжскай Камуны.

Гэта — твар сучасных канібалаў, якія зварочваюць Еўропу да самых жорсткіх часоў сярэдневяковага варварства, адраджаюць эпоху Торквемады і «свяцейшай» інквізіцыі.

Сёння, у дзень 18 сакавіка, мы ўшаноўваем памяць бязлітых афяр фашызма — гэтай адкрытай тэрарыстычнай дыктатуры найбольш рэакцыйных, найбольш шавіністычных, найбольш імперыялістычных элементаў фінансавага капітала. У гэты дзень мы дэманструем нашу брацкую салідарнасць з працоўнымі ўсіх краін, якія ў радах алзінага фронта змагаюцца супроць фашызма, супроць пагрозы вайны, супроць рэжыма голаду, жабрацтва, беспрацоўя і зверскага тэрора.

Люты германскі фашызм — рэжым сучасных людаедаў — ператварае вялікую культурную краіну ў суцэльны паліцэйскі засценак, у суцэльны канцэнтрацыйны лагер. Пад сякірай ката, у камерах катавання гінуць лепшыя барацьбіты германскага рабочага класа. Толькі за тры гады свайго існавання фашысты забілі ў Германіі, на далёка няпоўных даных, 10.000 антыфашысцкіх байцоў. У страшэнных умовах у канцэнтрацыйных лагерах і турмах фашысцкай Германіі пакутуюць дзесяткі тысяч чалавек.

Пад сякірай ката загінулі германскія рабочыя-камуністы Аўгуст Людгенс, Эдгар Андрэ, Фіцэ Шульце, германскі поправец Рудольф Клаус і шмат іншых. Рабочага Германа Шэфлера каты з Гестапо прывілі цвікамі да падлогі і потым праламалі яму чэрап.

У прыгожых гарадах і на астравах Італіі лепшыя сыны рабочага класа, барацьбіты за лепшую будучыню чалавецтва падвяргаюцца такім страшэнным здзекам і гвалтам, перад якімі блядняюць самыя гнусныя здзелкі царскай охранкі.

Італьянскія «чымізадары» ў Абісініі паказалі свой твар страшэннага фашысцкага звера. Пасля замаху на маршала Грацыяні ў Адыс-Абебэ кожны дзень гарэлі кастры, на якіх спальвалі тысячы трупаў расстраляных абісінцаў. Іх звальвалі ў кучы, аблівалі бензінам і падпальвалі. Атрады чорнарубашачнікаў бегалі па вуліцах, кідалі гранаты і падпальвалі агнямётамі хіжыны туземцаў.

Нельга без судрыгання і абурэння чытаць аб звярствах фашысцкіх наёмнікаў інтэрвентаў у Іспаніі.

«Для нашай канчатковай перамогі патрэбны намерці 3—4 мільёны іспанцаў»,— заявіў сучасны Галіфэ — фашысцкі генерал Кейпо дэ Льяно.

І ён са ўсім сальзмам і дзікай жорсткасцю звуногага звера, страціўшага ўсякае аблічча чалавека, імкнецца праводзіць гэта ў жыццё. Не адстае ад яго і верны халоп Гітлера і Мусаліні генерал Франко.

У Бадахосе фашысты расстралялі 7 тыс. рабочых, у Севільі — 9 тыс. чал., у Сарагосе — 4 тыс. чал. У адным толькі лазарэце ў Талеце забіта фашыстамі 600 раненых дружыннікаў.

Людзі, якія вырваліся з занятай фашыстамі Малагі, гаворацъ, што яны ніколі ў жыцці не забудуць жахаў фашысцкага тэрора. Тое, што адбылося ў Малазе, гэта бойня, якая не паддаецца апісанню. Паветра цудоўнага паўднёвага горада было насычана агідным пахам крыві і гарэлага мяса. Мясніцкі спакойна, халоднакроўна рабілі сваю гнусную, зверскую справу.

Германскія і італьянскія самалёты, як драпежніцкія сцярвятнікі, носяцца над мірнымі іспанскімі гарадамі і сёламі, расяваючы смерць і руйнаванне, забіваючы жанчын і дзяцей.

Такі лёс, такую расправу рыхтавалі германскія фашысты і японскія імперыялісты народам Совецкага Саюза пры дапамозе сваіх агентаў, шпіёнаў і дыверсантаў з антысовецкай трацкісцкай банды.

У барацьбе супроць фашызма — злейшага ворага працоўнага чалавецтва — расце, шырыцца, мацнее алзіны народны фронт, закаляюцца рады рэвалюцыйных байцоў.

Германская компартыя ў рэвалюцыйным падполлі вядзе бясстрашную барацьбу з агалцелай фашысцкай рэакцыяй. На эшафотах, пад сякерай, узнятай катам, германскія камуністы мужна кідаюць вораг праўду рэвалюцыі, горда і бясстрашна глядзяць у твар смерці.

Прадсмяротнае пісьмо Эдгара Андрэ сваёй жонцы з'яўляецца выдатным узорам бясстрашнасці, гераізма і мужнасці рэвалюцыйнага байца. Гэта пісьмо прасякнута глыбокай верай і свядомасцю правоты сваёй справы і няўхільнасці перамогі пралетарскай рэвалюцыі.

Фашысцкія засценкі не зламілі палкага духу і волі да барацьбы правадыра германскай комуністычнай партыі Эрнста Тэльмана, якога фашысцкія турэмшчыкі ўжо 4 гады трымаюць у сваіх лапах.

Член ПК германскай компартыі Ганс Беймлер загінуў гераічнай смерцю ў баях пад Мадрыдам, аддаўшы сваё жыццё за справу вызвалення Іспаніі ад фашысцкага пракабесся.

Іспанскія антыфашысты, іспанскі народ упісалі цудоўныя старонкі ў гісторыю барацьбы з фашызмам. 4 месяцы абароны Мадрыда — Вэрдэна Іспаніі — супроць аб'яднаных сіл міжнароднай рэакцыі — з'яўляецца пераўзойдзеным узорам выключнага гераізма, мужнасці і стойкасці. Міралюбівы іспанскі народ у алзіным парыве аб'яднался на абароны сваёй незалежнасці і дэмакратычных свабод. Ён вядзе барацьбу за справу ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва супроць фашысцкага варварства і пракабесся. Мужчыны і жанчыны, старыкі і дзеці, рабочыя і сяляне, людзі мастацтва і навукі, народы Іспаніі — іспанцы, каталонцы і баскі, усе партыі, усе — за выключэннем кучкі прадажных генералаў і наймітчыкаў, а таксама подлых трацкістаў — аб'ядналіся ў алзіны народны фронт для абароны свабоды і міру.

«Лепш памерці свабодным, чым жыць рабом» — пад гэтым лозунгам барацьбіты рэспубліканскай Іспаніі паказваюць сапраўдныя цуды гераізма.

Маладая комсамолка Ліна Одена пусвае сабе кулю ў лоб, каб не трапіць у рукі азвярэлай фашысцкай банды.

Ніякія танкі, аэрапланы, полчышчы фашысцкіх інтэрвентаў не могуць зламіць волі іспанскага народу да перамогі над сіламі фашызма.

Усе прынцыпі свабоды і міру, усё лепшае ў чалавецтве з любоўю і гарачымі сімпатыямі сочаць за гераічнай барацьбой іспанскага народу. Працоўныя Германіі і Італіі з вялікай рызыкай, пад страхам смерці і катаргі збіраюць сродкі ў дапамогу іспанскаму народу.

Фашызм можа падтрымаць сваё панаванне толькі з дапамогай штыхоў і самага зверскага тэрора. Фашысцкая дыктатура, як сказаў тав. Дзімітраў на VII кангрэсе Коміцерна, гэта ўлада лютая, але не трывалая. Разнузданы тэрор — доказ слабасці, а не сілы фашызма.

Наперакор фашысцкаму тэрору расце несакрушальная сіла міжнароднай пролетарскай салідарнасці. СССР — алзіная ў свеце краіна соцыялізма, крэпасць сусветнай рэвалюцыі — сваім існаваннем, сваімі вялікімі перамогамі натхняе рэвалюцыйных барацьбітоў на новыя подвігі, на бязлітасную барацьбу з рэжымам тэрора, голаду і вайны.

БУТОМАЎ.

ЭРНСТ ТЭЛЬМАН — правадыр і кіраўнік германскай компартыі і працоўных Германіі, палкі барацьбіт супроць фашызма — ужо на працягу 4 год пакутуе ў фашысцкім засценку.

СВАБОДУ ТЭЛЬМАНУ! — такі баявы лозунг антыфашыстаў усяго свету.

СЯМ'Я МОПРАЎЦАЎ

Сорак год свайго жыцця Бені Гольберг не меў сваёй радзімы — радзімы, якая-б дала яму ўсе чалавечыя правы. Калі ён яшчэ не нарадзіўся, памёр яго бацька, які ўсё сваё бязрадаснае жыццё прапрацаваў па найму шаўцом. Маці не мела ніякіх магчымасцей выхоўваць нованароджанага сына. Голад прымусіў яе аддаць двухтыднёвага хлопчыка сваім бацькам, а самой ехаць у Кроменчуг карміць малаком панскіх дзяцей. Нават у першыя дні свайго жыцця Бені быў пазбаўлен ласкі маперы і матчынага малака.

Васьмі год яго аддаюць вучыцца да бляшанніка, потым да коваля, столяра. Трынаццацігадовы хлопчык бяжыць да сваёй сястры ў Амерыку ад такой лютай мачахі-радзімы, якой з'яўлялася царская Расія. Колькі прыгожых і маляўнічых перспектыў паўставала ў дзіцячай галаве Бені, калі ён ехаў у гэту дзіўную краіну «просперыці»! Там ён імкнуўся знайсці сваё шчасце, сваю радзіму. Але ўсё дарэмна...

Амерыка сустрэла яго сурова. Тры гады ён блукаецца па гэтай краіне бесперапынным. Трывожныя ночы, праведзеныя ў крыдорах чужых домаў, каля паравых труб, пераканалі яго, што і тут ён не знайшоў сваёй бацькаўшчыны, свайго шчасця. А потым пачалася цяжкая праца столяра Гольберга на эксплаататараў.

Супроць лютай эксплаатацыі і прыніжэння чалавечай годнасці ён разам з тысячамі такіх-жа, як сам, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі арганізоўвае стачкі, выступае з пратестамі на мітынгах. За законныя чалавечыя патрабаванні яго збіваюць, а потым арыштоўваюць і саджаюць у турму.

— 14 ліпеня 1927 года, — расказвае Гольберг, — у забастоўны механічнікоў мяне паранілі. Я атрымаў пералом правай рукі і быў разбіт чэрап. Але, не гледзячы на гэта, мне далі яшчэ шэсць месяцаў турэмнага зняволення...

Асабліва памятна Гольбергам пасавая дэманстрацыя беспрацоўных Нью-Ёрка, якая адбылася 2 сакавіка 1930 года. У гэтай дэманстрацыі прымала ўдзел уся сям'я пролетараў Гольбергаў — бацька, маці і 10-гадовы сын.

— Мы прасілі толькі работы, — расказваюць яны, — але ў адказ атрымалі паліцэйскія дубінкі, якімі быў збіт наш 10-гадовы сын піонер Ефім. Лютая праца нават у такой краіне як Злучаныя Штаты Амерыкі, якія ганараца сваёй дэмакратычнасцю, не з'яўляецца «шчасцем» кожнага працоўнага. Мільёны беспрацоўных пазбаўлены гэтага «шчасця».

— Зараз мы з'яўляемся грамадзянамі совецкай дзяржавы, — з пачуццём вялікага гонару гаворацъ Гольберг. — Наша сям'я, як і ўсе працоўныя Совецкага Саюза, мае права на працу, на асвету і адпачынак. Гэта права завяваюна ўпартай барацьбой многанацыянальнага совецкага народу. Гэтымі правамі і карыстаецца ўся наша сям'я.

Вось ужо каля трох год, жывучы ў квітнеючай краіне соцыялізма, сям'я Гольбергаў ніколі не забывае аб барацьбітах за справу комунізма ў капіталістычных краінах, аб паліцэйзаваных фашысцкіх засценках. Уся сям'я Гольбергаў актыўныя члены МОПР'а. Член партыі жонка Гольберга Гасі Землавіч з'яўляецца членам прэзідыума ЦК МОПР'а БССР.

Гольберг расказвае пра сваю вытворчую і грамадскую работу (ён — стахана вен завода імя Молатава і дэпутат менскага горсовета), работу сваёй жонкі, пра вучобу сына-комсамольца (вучня 10-га класа) і аб яго жаданні стаць абавязкова інжынерам. Расказвае аб тым, што кожны год ён бывае на курорце, а вось нядаўна сям'я пераселілася ў новую кватэру з двух пакояў, кухняй і ваннай.

— На 41 годзе жыцця я знайшоў сваю радзіму, знайшоў так доўга шуканае шчасце, — заканчвае ён.

Н. ВІШНЕЎСКІ.

ПАЧУЦЦЁ ПРОЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМА

Нядаўна ў Маскве адбылася ўсесаюзная нарада актывістаў калгасных мопраўскіх ячэек. З БССР дэлегатам быў член інтэрнацыянальнага калгаса «Чырвоны арэты» Беразоўскага сельсавета, Мозырскага раёна шасцідзесяцігадовы старык т. Арон Бруднэр. Калі ён скончыў свой расказ аб жыцці калгаса і аб рабоце мопраўскай ячэйкі, доўга не змаўкалі апладысменты, а т. Стасава абняла і моцна пацалавала яго.

Тав. Бруднер расказаў, што ён зусім нядаўна перастаў маліцца богу і што толькі ў калгасе знайшоў ажыццяўленне сваіх мараў. Словамі ад шчырага сэрца старык гаварыў аб людзях, якія пакутуюць у турмах капіталістычных краін. Затым паведаміў простыя, але яркія вёсткі аб тым, што робіцца ў калгасе для маральнай і матэрыяльнай падтрымкі барацьбітоў за свабоду.

У 1933 годзе ў ячэйцы МОПР гэтага калгаса налічвалася 54 члены, а ў гэтым годзе — 170, з іх 109 беларусоў, 40 яўрэяў, 13 украінцаў і 8 палякаў. Дружнай сям'ёй яны будуюць сваё шчаслівае жыццё і дружнай сям'ёй яны сочаць за падзеямі, якія адбываюцца за рубяжом.

Доўгімі зімовымі вечарамі збіраліся калгаснікі і калектыўна абмяркоўвалі і пісалі пісьмы палітзняволеным Лукішкай турмы (Польшча). Цёплыя словы падбадзёрвання, любоў да братоў на класу гучэлі ў кожным радку. Калгаснікі з натхненнем прынялі ў ганаровыя члены калгаса гераічнага правадыра германскага пролетарыята тав. Эрнста Тэльмана. На яго працоўную кніжку ў карысць МОПР'а адлічана 365 працадзён, што складае 407 кілаграмаў зерневых, 2920 кілаграмаў бульбы і 450 руб. грашыма. У карысць жанчын і дзяцей Іспаніі сабралі 280 руб. 50 кап. і вызначылі двухгадовага бычка.

Такія людзі, такія справы, як у калгасе «Чырвоны арэты», ёсць ва ўсіх кутках нашай радзімы. Вось Ефрэм Гладышаў — вядомы стаханавец бабруйскага хрэвамрапоўчага камбіната, дэлегат і член рэдакцыйнай камісіі Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў. Ён алзін з найбольш актыўных мопраўцаў і ініцыятараў арганізацыі стаханаўскіх брыгад імя Тэльмана, Ракоші і Дзімітрава. На камбінаце вырасла буйная мопраўская арганізацыя з 3.500 рабочых, служачых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Вязні белостоцкай турмы не раз чыталі пісьмы камбінацкага калектыва мопраўцаў.

Або вось факты выключна высокай свядомасці і інтэрнацыяналізма. Жанчыны — хатнія гаспадыні, жонкі рабочых і служачых горада Жлобіна — доўга не прымалі ўдзелу ў мопраўскай рабоце. Дэпутатка горсовета т. Камякова першая праявіла ініцыятыву і арганізавала вулічную ячэйку МОПР'а. Гэты прыклад адразу падхапілі, і цяпер у Жлобіне арганізаваны 30 мопраўскіх ячэек хатніх гаспадынь, кожная з якой яцае па 30—50 чалавек. Старшыня ячэйкі Палявой вуліцы т. Нікалаева праводзіць з хатнімі гаспадынямі чыткі аб жыцці і барацьбе працоўных капіталістычных краін, пасылае пісьмы палітзняволеным, арганізавала мопраўскі куток, у якім устаноўлены дзяжурствы. Летам жанчыны арганізавалі прапоўку агарода і зароблены грошы перавялі на рахунак МОПР'а. 60-гадовая хатняя гаспадыня т. Асоўская наладзіла збор утыльсыравіны, і ў сваім доме прадаставіла пакой для мопраўскага кутка.

Работніцы менскай фабрыкі імя 8 сакавіка ў вольны час сваімі рукамі шылі камплекты бялізны для дзяцей другога інтэрнацыянальнага дзіцячага дома. Працоўныя Віцебска адправілі дому 7 вагонаў мэблі, працоўныя Менска — абутак, адзенне, цацкі і т. д. На віцебскай трыкатажнай фабрыцы імя КІМ рабіліся майкі для дзяцей. Сярод велізарных спраў дырэктар фабрыкі т. Хапіна знаходзіла час асабіста сачыць за вырабам гэтых маек.

Калгаснікі Совецкай Беларусі выконваюць свой інтэрнацыянальны абавязак. Калгаснікі-мопраўцы калгаса імя Стасавай Прошінскага сельсавета, Бабруйскага раёна арганізавалі ячэйкі МОПР у 5 суседніх калгасах. У калгасах «Чырвоная Трасцяніца» Кіпчына-Слабодскага сельсавета, Барысаўскага раёна, «Усход» Копыльскага раёна і т. д. сістэматычна праводзяцца чыткі матэрыялаў і гутаркі на тэмы міжнароднага становішча. У гэтых калгасах і дзесятках іншых вылучаны для засеву спецыяльныя мопраўскія гектары.

У многіх калгасах БССР ганаровымі калгаснікамі з'яўляюцца лепшыя сыны працоўнага народу — тт. Тэльман, Ракоші, Эдгар Андрэ і інш. барацьбіты за справу вызвалення працоўнага чалавецтва. Любоў да іх выражаецца не толькі ў тым, што іх партрэты можна знайсці ва ўсіх мопраўскіх кутках, але і ў тым, што калгаснікі з радасцю прымаюць іх у роўнапраўныя члены сваёй працоўнай сям'і. Эрнст Тэльман — ганаровы калгаснік трох калгасаў Мозырскага раёна і 5 калгасаў Ельскага раёна.

Усе гэтыя яркія факты гавораць самі за сябе. У іх выяўляецца глыбокі інтэрнацыяналізм і брацкая салідарнасць працоўных нашай вялікай соцыялістычнай радзімы з працоўнымі капіталістычных краін, для якіх СССР — пуцяводная зорка.

Н. ГАСМАН.

ДРУЖБА

ГОМЕЛЬ (Кар. «Звязды»). Шчаслівыя дзеці краіны соцыялізма, як і ўсе працоўныя вялікага Совецкага Саюза, з захапленнем сочаць за гераічнай барацьбой іспанскага народу супроць азвярэлага фашызма. Яны разам са сваімі бацькамі перажываюць поспехі і няўдачы рэспубліканцаў Іспаніі.

Піянеры гомельскіх школ, авалодаўшыя мовай эсперанто, завязалі ажыўленую перапіску з дзецьмі гераічнага іспанскага народу. Дзеці-гомельчане ў сваіх пісьмах вітаюць гераічную барацьбу іспанцаў супроць фашызма і расказваюць ім аб сваім шчаслівым жыцці, якога дабіліся працоўныя нашай краіны.

На пісьмо гомельскіх піянераў піянеры Валенсіі прыслалі наступны адказ:

«Дарагія таварышы з Гомеля! Мы з радасцю прымаем вашу прапанову завязаць перапіску. Вы шчаслівы, што жывеце ў свабоднай краіне, якую вашы гераічныя бацькі адвавалі ў капіталістаў. Наш рэспубліканскі ўрад стварыў нам зараз усе магчымасці для вучобы.

Некалькі дзён назад міністр асветы іспанскага ўрада запрасіў нас ў кіно, дзе нам паказалі совецкі фільм «Мы з Кранштата». Ён гэты фільм вельмі спадабаўся. Мы радаваліся за мужнасць вашых бацькоў у час грамадзянскай вайны, якая заражае гераізмам нашых байцоў. Міністр асветы ў часе святкавання дзіцячага тыдня раздаваў нам — валенсійскім дзецям — совецкія падарункі, якія вы нам прыслалі. У канцы святкавання адбыўся цікавы карнавал.

Іспанія—наша дарагая радзіма—хочэ быць такой-жа свабодай, як і ваша краіна. Вось таму яна і змагаецца супроць фашызма. Фашысты імкнуцца авалодаць Іспаніяй для таго, каб устанавіць сваю дыктатуру. Ім гэта не ўдасца. Іспанія будзе магілай для фашызма».

Пісьмо падпісалі 33 піянеры. Апрача такіх калектыўных пісем, гомельскія піянеры атрымліваюць пісьмы і ад асобных піянераў Іспаніі.

Праз вароты, рублёны і межы дзеці працоўных усяго свету завязваюць паміж сабой цесную, брацкую, інтэрнацыянальную дружбу. Гэта дружба — зарука знішчэння межаў паміж народамі ў будучым.

П. ЧЫКУН.

ПАРЫЖСКАЯ КОМУНА

66 год назад, 18 сакавіка 1871 г., рабочыя Парыжа ў выключна цяжкіх гістарычных умовах абвясцілі Парыжскую Комуну, узялі ўладу ў свае рукі. Чырвоны сцяг упершыню стаў дзяржаўным сцягам Парыжа.

Паражэнне Францыі ў вайне з Германіяй было рэзультатам поўнай няздольнасці кіруючага класа французскай буржуазіі абараніць краіну ад знешняга ворага. Абурэнне мас супроць прадажных клік капіталістаў і памешчыкаў, якія нажываліся на народным няшчасці, страшэнная эксплаатацыя пролетарыята і яго беспрацоўе, разарэнне дробнай буржуазіі— усё гэта выклікала велізарнае рэвалюцыйнае бражэнне ў рабочым класе. Гэтыя ўнутраныя і знешнія прычыны штурхнулі парыжскае насельніцтва да рэвалюцыі, перадаўшай уладу ў рукі нацыянальнай гвардыі, узброенай сілы рабочага класа і працоўных Парыжа.

Рэвалюцыя 18 сакавіка 1871 г. абвяшчэнне Комуны азначала, што ўлада з рук памешчыкаў і буржуазіі перайшла ў рукі пролетарыята. — «Рух Комуны, — падкрэсліваў Ленін, — павінен быў неазбежна атрымаць соцыялістычную афарбоўку, гэта значыць пачаць імкнуцца да ліквідацыі панавання буржуазіі, панавання капітала, да разрушэння саміх асноў сучаснага грамадства». (Ленін. Збор твораў т. XV, стар. 158).

І сапраўды, соцыяльна-палітычныя мерапрыемствы, якія праўда, недастаткова нашуча праводзіла Комуна, падкрэслівалі яе характар, як новай, сапраўды дэмакратычнай, пролетарскай улады. Такія мерапрыемствы, як адлучэнне царквы ад дзяржавы, забарона начной працы ў булачных, перадача майстэрань і фабрык, пакінутых гаспадарамі, у рукі рабочых арцелей, адмена сістэмы штрафаў на прадпрыемствах, адабрэнне школ з ведання царквы і т. д., — красамоўна паказвалі народным масам, што рэвалюцыя 18 сакавіка зроблена ў іх прамых інтарэсах. Вялікі заснавальнік навуковага соцыялізма Карл Маркс даў вычарпальную характарыстыку класавай сутнасці Парыжскай Комуны. «Яна (гэта значыць Парыжская Комуна. Рэд.) была па сутнасці справы ўрадам рабочага класа, рэзультатам барацьбы прадукцыйнага класа супроць класа прысвайваючага, яна была адкрытай, нарэшце, палітычнай формай, пры якой магло адбыцца эканамічнае аслабанне працы». (К. Маркс. Выбраныя творы. Т. II. стар. 398). Вялікі саратнік Маркса Фрыдрых Энгельс высока ацэньвае гістарычнае значэнне вопыту Парыжскай Комуны, бачыў у ёй прабраз дыктатуры пролетарыята.

І не дзіва, што ўсе сілы рэакцыйнай буржуазіі, усе цёмныя сілы буржуазнага грамадства аб'ядналіся, каб патапіць у крыві гераічнае паўстанне парыжскіх рабочых. Французская буржуазія на чале з Цьерам, заключыўшы згоду з правадыром германскай буржуазіі Бісмаркам, сабрала ў Версалі армію і падавіла рэвалюцыйны Парыж. На дзесятках тысяч трупаў комунараў буржуазія аднавіла сваю ўладу. Крывавы майскі тыдзень 1871 г. назаўсёды астанецца ў памяці пакаленняў, як праяўленне самага раз'ютанага буржуазнага белага тэрора. 30.000 парыжан было забіта версальскімі катамі, 45.000 арыштавана, дзесяткі тысяч сасланы на катаргу. Усяго Парыж згубіў да 100.000 сваіх сыноў, а ў тым ліку лепшых рабочых.

Паражэнне Парыжскай Комуны было паскорана радам цяжкіх памылак, зробленых самімі комунарамі. Уладзімір Ільіч Ленін указваў што «дзве памылкі пагубілі плады бліскучай перамогі. Пролетарыят астанавіўся на поўшляху: замест таго каб прыступіць да «экспрапрыяцыі экспрапрыятараў» ён захапіўся марамі аб устанаўленні вышэйшай справядлівасці ў краіне, якая аб'ядналася агульнанацыянальнай задачай; такія, напрыклад, установы, як банк, не былі ўзяты, твораў пруданістаў наконт «справядлівага абмену» і т. д. пазнавалі яшчэ сярод соцыялістаў. Другая памылка — злішняя вялікадушнасць пролетарыята: патрэбна было знішчаць сваіх ворагаў, а ён імкнуўся маральна ўздзейнічаць на іх, ён пагарджаў значэннем чыста ваенных дзеянняў у грамадзянскай вайне і замест таго, каб рашучым наступленнем на Версаль увянчаць сваю перамогу ў Парыжы, ён пагарджаў і даў час версальскаму ўраду сабраць цёмныя сілы і падрыхтаваць да крывавага майскага тыдня». (Ленін. Збор твораў, т. XII, стар. 163).

Рабочы Парыж апынуўся ў вогненным кальцы блакады. Парыжская Комуна была ізалявана ад свайго натуральнага саюзніка — сельскагаспадарчага пролетарыята і вясковай бедноты.

Усе гэтыя памылкі ў канчатковым выніку былі абумоўлены тым, што на чале Комуны не было алзінай рэвалюцыйнай партыі з чоткай і яснай класавай праграмай, партыі, ведаючай, як і кулы вёсці справу рэвалюцыі. Адсутнасць алзінай пролетарскай партыі вяла да перашучасці, да хістанняў, да бясплодных спрэчак, у той час, як патрэбна было дзейнічаць, бязлітасна праследаваць ворага, падаўляць контрэвалюцыйныя элементы ўнутры самаго Парыжа.

Наша Вялікая соцыялістычная рэвалюцыя перамагла іменна таму, што рабочым класам і працоўнымі масамі кіравала алзіная, моналітная, з выразнай рэвалюцыйнай праграмай партыя большэвікоў, партыя Леніна—Сталіна. «Беспадзельнае панаванне адной партыі, партыі комуністаў, як асноўны момант падрыхтоўкі Кастрычніка, — такая характэрная рыса Кастрычніцкай рэвалюцыі, такая першая асаблівасць тактыкі большэвікоў у перыяд падрыхтоўкі Кастрычніка», — указваў таварыш Сталін.

«Наўрад ці патрэбна даказваць, што без гэтай асаблівасці тактыкі большэвікоў перамога дыктатуры пролетарыята ў абстаноўцы імперыялізма была-б немагчыма.

Гэтым выгодна адрозніваецца Кастрычніцкая рэвалюцыя ад рэвалюцыі 1871 года ва Францыі, дзе кіраўніцтва рэвалюцыяй дзялілі паміж сабою дзве партыі, з якіх ні адна не можа быць названа комуністычнай партыяй». (І. Сталін. «Пытанні ленінізма», выд X., стар. 91).

Акружаная з усіх бакоў ворагамі, Комуна напярэдадні паражэння. Але комунары Парыжа пралілі сваю кроў не даремна. Урокі і памылкі Парыжскай Комуны былі ўлічаны нашай вялікай большэвіцкай партыяй, партыяй Леніна—Сталіна, у яе барацьбе за перамогу дыктатуры пролетарыята, за перамогу соцыялізма. Ленін указваў, што «Совецкая ўлада ёсць другі сусветна-гістарычны крок або этап развіцця дыктатуры пролетарыята. Першым крокам была Парыжская Комуна» (Ленін. Творы т. XXIII, стар. 496). Сцяг, узняты парыжскімі комунарамі 66 год назад, ідэі парыжскіх пролетараў перамаглі поўнасцю на адной шостай частцы зямнога шара — у вялікім Совецкім Саюзе. Соцыялізм у нашай краіне перамог канчаткова і беспаваротна. Пад кіраўніцтвам вялікага правадыра справы Леніна таварыша Сталіна наша партыя прывяла працоўных Краіны Советаў да бліскучых перамог. Як магутны ўцёс, высіцца наша радзіма сярод капіталістычнага акружэння, указваючы ўсім народам на алзіны шлях да пазбаўлення ад фашысцкага рабства. Мы пабудавалі магутную соцыялістычную індустрыю. Калгасны лад канчаткова перамог. Ліквідаваны эксплаататарскія класы. Велізарны рост матэрыяльнага дабрабыту народных мас, росквіт нацыянальнай на форме і соцыялістычнай па зместу культуры народаў СССР, стахаўскі рух — найярчэйшае сведчанне невычарпальных творчых магчымасцей нашага народу, найвялікшы міжнародны аўтарытэт нашай краіны, якая ідзе ў авангардзе ўсяго перадавога і прагрэсіўнага чалавецтва, — такія сусветна-гістарычныя поспехі народаў Совецкага Саюза, дасягнутыя пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Нашы завадзёвы адлюстраваны ў артыкулах Сталінскай Канстытуцыі — гэтага найвялікшага гістарычнага дакумента ўсіх часоў і народаў.

Але разам з тым гадавіну Парыжскай Комуны мы адзначаем у напружанай міжнародній абстаноўцы. Германскі фашызм пагражае ўсяму свету, адкрыта падрыхтоўвае ваенны напад на Совецкі Саюз. Германскі і італьянскі фашызм выступіў у якасці душыцеля іспанскага народу, гераічна адстойваючага сваю свабоду і незалежнасць ад азвярэлых банд фашысцкіх мяцежнікаў. На палях Іспаніі разгарнуўся гістарычны бой паміж сіламі свабоды, прагрэса і дэмакратыі — з аднаго боку, і сіламі фашысцкай рэакцыі і варварства — з другога. На баку рэспубліканскай Іспаніі—усё перадавое і прагрэсіўнае чалавецтва. На Ўсходзе — японскі імперыялізм працягвае сваю палітыку грабежніцкіх захопаў у Кітаі, рыхтуецца стварыць ва ажуцяванай ім Манчжурыі плацдарм вайны з Совецкім Саюзам. Германскі фашызм і японскі імперыялізм — гэтыя падпальшчыкі вайны — рыхтуюцца ажыццявіць сваю фашысцкую праграму перадзелу свету.

Пранёс праклятых ворагаў народу — трацкісцкіх забойц, шпіёнаў, шкоднікаў і дыверсантаў, наймітаў фашысцкай охранкі, выкрыў перад усім светам гнусныя планы германскага фашызма і японскага імперыялізма і іх подлай агентуры з трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў. Пранёс алкачасова выкрыў і іх пасобнікаў — правых контрэвалюцыянераў.

Але з кожным днём мацнее адпор народных мас фашысцкім пракабесам і падпальшчыкам вайны. Гераічная супраціўленне іспанскага народу фашысцкім катам і інтэрвентам умацавала сілы антыфашысцкага лагера ва ўсім свеце.

Вялікі Совецкі Саюз зяе яркімі агнямі соцыялістычнай будоўлі, асвятляючы, як магутны пражэктар, шлях усім працоўным, натхняючы іх на рашучы бой з капіталізмам. «Цяпер, калі магутная хваля фашызма аплёўвае соцыялістычны рух рабочага класа і змешвае з грязёй дэмакратычныя імкненні лепшых людзей цывілізаванага свету, новая Канстытуцыя СССР будзе абвінавачыць акцам супроць фашызма, гаворачым аб тым, што соцыялізм і дэмакратыя непераможны. Новая Канстытуцыя СССР будзе маральнай дапамогай і рэальнай палмогай для ўсіх тых, хто вядзе цяпер барацьбу супроць фашысцкага варварства». (Сталін. Даклад на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'езде Советаў).

Дзень Парыжскай Комуны з'яўляецца днём Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МОПР), арганізацыі, прызванай, па выражэнню слаўнага рулявога Комуністычнага Інтэрнацыянала тав. Дзімітрава, стаць свайго роду «Чырвоным крыжам» алзінага фронта пролетарыята і антыфашысцкага народнага фронта. Нашы думкі звернуты да гераічных іспанскіх барацьбітоў, да ўсіх нашых зарубежных таварышоў, да ўсіх вязняў фашызма, якія пакутуюць у турмах капітала. Мы гаворым ім: мужайцеся, нашы баявыя таварышы! Працоўныя ўсяго свету помняць аб вас!

Мы звяртаемся да германскіх рабочых, якія змагаюцца ў цяжкіх умовах фашысцкага гнёту за свае правы, да кітайскіх рабочых і сялян, якія мануюць антыяпонскі нацыянальны фронт, да ўсіх прыгнечаных народаў калоніі, якія паўстаюць супроць імперыялізма, мы звяртаемся да ўсіх працоўных, якія згуртоўваюць свае сілы пад сцягам антыфашысцкага фронта, і гаворым ім: мужайцеся! З кожным днём і галзінай мацнее справа міжнароднай пролетарскай салідарнасці! Перамога ваша блізка!

Жыве ў стагоддзях бяссмертная памяць аб гераічнай Парыжскай Комуне! Жыве і квітнее вялікі Совецкі Саюз, магутная радзіма працоўных усяго свету, надзея ўсяго чалавецтва.

Г. ГЕЙЛЕР.

Барожая дзейнасць на бровары „Грудзінаўка“

(Пісьмо слушачага)

У чэрвені 1936 года бровар «Грудзінаўка». Быхаўскага раёна быў спынены на капітальны рамонт тэрмінам на два з палавой месяцы. Але з-за злачыннага кіраўніцтва дырэктара Сапаженкі і тэхніка Данілава ўрадавыя тэрміны былі сарваны. Завод быў пушчаны ў эксплаатацыю са спазненнем больш, чым на два з палавой месяцы.

Рамонтам кіраваў тэхнарук Данілаў, які пры поўнай страце класавай пільнасці, прыватнай партыйнай арганізацыі і кіраўніцтва завода усімі метадамі шкодзіў. Па яго ўказанню сцены саладоўні зробілі так, што ўжо далі вялікія трэшчыны. Змеевікі (трубы ў брадзільных чанах) цякуць. З прычыны дрэннага кітлаправяння машына не цягне нават таго, на што пягнула да рамонту.

Па прапанове Данілава, безупоўна не ведама Сапаженкі, бардовая яма пакавана прама на вуліцы, і кожную мінуту могуць быць катастрафічныя выпадкі. Пядаўна ў яму ўваліўся рабочы т. Бынікаў і моцна апёкся.

Не інакш, як па ўказанню таго-ж Данілава яго сын і сын заядлага трацкіста Прынячыка прабуравілі ў заставе труба 8 дзірак па 5 сант. кожная, адкуль вода забяспечваецца вадой. Калі-б не бяспасць рабочых, то ўся вада з возера Ста-б спушчана, і гэта прывяло-б да спынення завода.

Застаецца нічо дадаць, што на віне кіраўніку завода часта выпрабоўваецца зарплата з вялікімі перабоямі. Быхаўскія партыйныя арганізацыі і Белдзяржспірт не давяцца становішчам завода.

А. БЕЛАКУЗАЎ.

Быхаў. (Ад спец. карэспандэнта «Звязды»). Пісьмо тав. Белакузава пры праверцы на месцы цалкам пацвердзілася. Тавары завод «Грудзінаўка» адзін з самых адстаючых броварных заводаў БССР. Так мінулага года ім выканая на 91 проц., студзеньскі плян гэтага года — на 73,4 проц., лютаўскі — на 57,5 проц. Першай дэкады сакавіка — на 46,6 проц.

На заводзе панаруецца стахановскі рух. Тэхнічная вучоба і палітвыхаваўчая работа сярод рабочых не праводзіцца. Не наладжана вывучэнне гістарычных дакументаў — Канстытуцыі СССР і БССР.

На заводзе крытыка і самакрытыка не ў пашане. Кухарка сталовай тав. Кропікава асмелілася расказаць інструктару Белдзяржспірттрэста тав. Рышковічу аб злачынній дзейнасці адміністрацыі.

Хутка пасля ад'езду Рышковіча тав. Кропікава была зволена з працы.

Класавы вораг вольна арудуе на заводзе. Ён прыкладае свае брудныя рукі і да соцыялістычнай уласнасці. На заводзе масавыя растраты. Так, прыёмшчык сыравіны Васільчанка растраціў 2.058 руб., экспедытар Ганчароў — 1.119 руб., экспедытар Шарандзікаў — 1.853 руб. і інш. Усяго па заводу зарэгістравана растрат 24.468 рублёў. У канцы 1936 года з касы завода нейкім чынам было ўкрадзена 11.000 руб.

Тут расквітнела сямейнасць і дабрачынасць. Справа дайшла да таго, што дырэктар завода прэміраваў парторга Гаўрылянку за... эканомію гаручага. Бясспрэчна, што парторг не мог быць у даўгу. Ён пакрывае агідную дзейнасць дырэкцыі завода. Усім гэтым карыстаецца класавы вораг. Да апошняга часу праводзіў тут контрэволюцыйную работу закляты вораг народу трацкіст Купрыянчык. Партыйная арганізацыя завода праглядзела гэта. Праглядзела яна і агідную дзейнасць тэхнарука завода Данілава.

Здзіўляе пазіцыя пераўпільнасці, занятая быхаўскім райкомам партыі, які ведаў аб агіднасцях на заводзе, але ніякіх мер не прымаў.

Белдзяржспірттрэст (дырэктар Кузнічоў) аказаўся ў ролі гогалеўскага рэвізора. З трэста на завод прыязджала некалькі работнікаў, яны рэвізавалі і ад'язджалі, а становішча аставалася ранейшае.

Спадзяемся, што пракуратура БССР праверэвізуе больш дакладна і сур'ёзна становішча на заводзе.

В. АСТРОЎСКІ.

ПАД КРЫЛОМ СТАРШЫНІ КАЛГАСА

У 1935 годзе ў калгас імя Сталіна (Крацкі раён) прыехаў старшынёй Барыбка А. Пражыўшы 2 месяцы, ён прывёз калгас Шатовіча Лукаша і пусціў яго з сябе на кватэру. Праз некаторы час Барысёнка зрабіў яго сваім памеснікам. Давяраючы ад усякай работы, Барысёнка падаў брыгадзіру і рахункаводу залічыць Шатовічу кожны дзень па 1,5 працадня.

Пасля выявілася, што Шатовіч Лукаш ворат народу, раскрадальнік калгаснага добра. У 1936 годзе ў час абмалоту старшыня калгаса паставіў Шатовіча кладаўшчыком. Раскраўшы многа збожжа, старшыня прызначае яго адказным па ільну. Ён і тут займаецца крадзежам ільну, падроблівае грашовыя дакументы, крадзе калгасныя грошы.

Усё гэта на агульным сходзе калгаснікі выкрылі і пастанавілі зняць Шатовіча з работы. Аднак старшыня калгаса Барысёнка і зараз трымае гэтага жуліка, дае магчымасць раскрадаць калгаснае сена, салому, мякіну.

КАЛГАСНІКІ.

ЗАЦІСКАЮЦЬ САМАКРЫТЫКУ

Я першай уступіла ў калгас у 1931 годзе. Маемасць, жывёлу і насенне я аддала. Працую ў калгасе сумленна, але ў рабоце мне не дапамагаюць. Калі брыгадзіра крытыкуеш, дык штрафуюць працаднямі і грашыма. Я выпрацавала да 100 працадзён, а атрымала не столькі, колькі я зарабіла, бо праўленне разбазарыла шмат хлеба, вадзе калгас да разору.

Апрача гэтага, праўленне калгаса вымае жыта з маёй хаты. Ніхто ў калгасе з гэтага часу не пакланяцца, каб я дала сваю карову.

Прасіла я некалькі разоў кіраўнікоў калгаса раёна дапамагчы, але ніхто не звярнуў на мяне ўвагі. А тым часам клавы вораг арудуе ў нашым калгасе.

Калгасніца В. МАЦУРА.

Калгас «Пролетарская перамога», Старасляпоцкага сельсавета, Крупскага раёна.

ЖУЛІК НА ПАСАДЗЕ КАСІРА

(Пісьмо рабочых саўгаса)

Заработную плату рабочым саўгаса «Боркавічы», Дрысенскага раёна не выплачваюць на 3—5 месяцаў і дырэкцыя саўгаса лічыць гэта нармальным з'явішчам. Толькі ў пачатку сакавіка выплачвалі зарплату за кастрычнік, лістапад і снежань 1936 года. Калі будзе выплачана заработная плата за студзень і люты гэтага года — рабочыя не ведаюць.

Касір саўгаса Дзем'янчонак Уладзімер аблічвае рабочых і за гэтыя грошы п'янствуе. 27 лютага ён аблічыў работніцу Мятлюк Полю на 70 руб., Несцяронак Жэню на 10 руб., Міхальчанка Жэню на 12 руб., Голуба Антона на 25 руб.

Ведае аб гэтым дырэкцыя саўгаса, але ніякіх мер не прымае, і Дзем'янчонак працягвае сваю агідную справу.

РАБОЧЫЯ.

Тыпы абаронцаў барыкад Парыжскай Камуны.

ПІЛЬНА АХОЎВАЕМ ГРАНІЦЫ ДАЛЁКАЎСХОДНЯГА КРАЯ

(Пісьмо чырвонаармейца да прызыўніку 1915-16 года нараджэння)

Я з нецярпеннем чакаў прызыву ў рады РСЧА. І вось гэта жаданая мая мара збылася. Уже год як я знаходжуся ў радах РСЧА. Я пакляўся перад нашай партыяй і савецкім урадам, перад усім народам нашай квітнеючай радзімы быць верным воінам краіны соцыялізма. Ганаруся, што мне даверылі ганаровую справу—ахову ўсенароднага багацця ад інтэрвентаў, злейшых псоў—фашыстаў. З гонарам выконваю ўскладзеныя на мяне задачы і надалей буду выконваць гэта народнае даручэнне.

У імя сваёй радзімы я гатоў у любую мінуту на заклік партыі і ўрада рынуцца ў бой і, калі гэта патрабуецца, аддаць сваё жыццё, як Сямён Лагода.

Перад камандна-палітычным саставам сваёй часці я даю абавязацельствы поўнасцю авалодаць вазнай тэхнікай і да канца служыць у Чырвонай Арміі стаць зусім палітычна пісьменным грамадзянінам Саюза. Запэўніваю вас, што я з гонарам выканаю ўзятыя абавязацельствы.

Але разам з гэтым заваёраю вашу ўвагу—заўсёды быць пільнымі і ўмець распазнаваць класавых ворагаў, якую-б яны маску не адзелі. Глыбока вывучайце гістарычны дакумент—Сталінскую Канстытуцыю. Рыхтуйце з сябе для Чырвонай Арміі поўнацэннае папаўненне.

У заключэнне скажу—Чырвоная Армія на чале са сваім правадыром, першым маршалам Савецкага Саюза К. Е. Варашылавым—непераможна. І калі вораг адважыцца кінасці на нашы граніцы, то, як сказаў наш нарком, мы будзем біць яго на той тэрыторыі, адкуль ён прыйдзе.

Шлю чырвонаармейскае прывітанне з Далёкага Ўсхода будучым абаронцам граніц нашай радзімы, прызыўнікам 1915-16 года нараджэння.

Будзьце гатовы, таварышы, да прызыву 1937 года!

Чырвонаармеец 74-сай часці ОКДВА

Д. В. БУКАЦІЧ.

ДЗЕНЬ СОВЕЦКАГА СТРАЛКА

Па ўсяму Совецкаму Саюзу з 15 па 20 красавіка будзе праводзіцца дзень совецкага стралка. Гэта самае буйнае спартыўна-стралковае мерапрыемства бягучага года. Задача дня совецкага стралка—праверыць якасць падрыхтоўкі «варашылаўскіх стралкоў» першай і другой ступені, набліжаць увагу шырокіх мас працоўных з мэтай уцягнення іх у стралковы спорт і праверыць работу пастаянных камандваршылаўскіх стралкоў.

Надаючы выключную ўвагу гэтаму дню, прэзідыум Цэнтральнага совета Асаавіяхіма БССР абавязаў асаавіяхімаўскія арганізацыі гарадоў і раёнаў, як мінімум выставіць на спаборніцтвы 800 пастаянных каманд варашылаўскіх стралкоў першай ступені і 70 каманд другой ступені. Не пазней 1 красавіка ва ўсіх раёнах павінны быць праведзены спецыяльныя дні, прысвечаныя стралковаму спорту.

Для раёна, які зойме першынства ў спаборніцтвах, вызначана прэмія—матацыкл. Многа каштоўных прэмій вызначана для кіраўнікоў стралковага спорта, каманд і індывідуальных пераможцаў.

Гарком комсамола адарваны ад сапраўднага жыцця

Ужо каля пяці месяцаў прайшло з таго часу, як адбыўся другі пленум ЦК ВЛКСМ, які ўказаў на зусім нездавальняючую пастаноўку прапагандысцкай работы сярод комсамольскай і моладзі. Пленум вынес рад рашэнняў, якія абавязваюць комсамольскія арганізацыі перабудаваць сваю работу ў адпаведнасці з рашэннямі X з'езда комсамола. Пленум указаў, што комуністычнае выхаванне моладзі павінна з'явіцца асноўным у рабоце комсамольскіх арганізацый.

Аднак прапаганда, як асноўны сродак комуністычнага выхавання моладзі, яшчэ далёка не заняла рашаючага месца ў рабоце менскага гаркома комсамола. Пастаноў, агульных разважанняў аб «зрухах», «дасягненнях у справе выхавання моладзі» тут многа. Тав. Чучко (загадчык аддзела палітвучобы гаркома комсамола) нават і лічбы патрэбныя можа ўказаць: колькі арганізавана гурткоў, колькі ў іх займаецца чалавек і тут-жа дадае, што «ў гэтай галіне мы маем значны пералом».

На вялікі жаль, работнікі гаркома комсамола за патокам агульных разважанняў аб неіснуючых «дасягненнях» і мёртвых лічбаў, якія яны сабралі пры дапамозе тэлефонаў, страцілі канкрэтную справу — справу комуністычнага выхавання жывых людзей — моладзі. Аб гэтым гаворыць рад фактаў.

Па гораду налічваецца (згодна ўліку ГК) 9.282 комсамольцы, з якіх палітвучобу наведваюць толькі 8.296 чалавек. 986 комсамольцаў не ахоплены палітвучобай. Сярод гэтых людзей значную частку займаюць комсамолкі-маперы, якія маюць дзяцей і не могуць наведваць палітзаняткаў. Аб іх выхаванні ніхто не клапоніцца. Хатніх заданняў ім не дадуць, а гарадскі камітэт, ведаючы аб гэтым, бездапаможна разводзіць рукамі: «Нічога не можам зрабіць, малыя дзеці». І тут-жа выказвае спачуванне вясьні комсамолкам пчотачнай фабрыкі, якія маюць малых дзяцей і не могуць наведваць заняткі палітгурткі.

Шмат комсамольцаў-адзіночак таксама прадастаўлены самі сабе, і толькі гэтымі днямі пры Варашылаўскім РК комсамола пачалі арганізоўваць для іх спецыяльную палітшколу. Што датычыць палітычнай вучобы несаюзнай моладзі, то аб ёй гарадскі камітэт наогул ніякіх вестак не мае. Гэта не магло не адбіцца на арганізацыйным росце комсамола. У менскім ВПІ налічваецца 22 палітгурткі несаюзнай моладзі. Згодна «ўліку» комсамольскага камітэта ВПІ, уся несаюзная моладзь інстытута ахоплена палітвучобай. Аднак якасць палітычны ўзровень гэтай вучобы зусім ніякі.

Работнікі гаркома родна бываюць на вясцах, на палітзаняткам. ГК нават не ведае, у якія дні займаюцца палітгурткі пры навучальных установах. Не праверяюць работу гэтых школ і іх палітычны ўзровень. Кіраўніцтва прапагандай у большасці аддаюцца габінетным пародкам.

Па комсамольскай сетцы лічыцца 427 палітгурткоў і школ, з якіх толькі 415 маюць пастаянных прапагандыстаў. 12 гурткоў не маюць прапагандыстаў і па сутнасці справы яны існуюць на паперы. Гарком комсамола не арганізаваў прапагандыстам сістэматычнай дапамогі для павышэння іх ідэйна-палітычнага ўзроўню, у выніку чаго палітзаняткі праходзяць на зусім нізкім палітычным узроўні (друкарня імя Сталіна, прапагандыст Шамігаў, завод «Чырвоная зара» — прапагандыст Эсманд), а ў радзе месц прапагандысты даюць зусім няправільную, шкодную ўстаноўку, скажаюць важнейшыя пытанні гісторыі ВКП(б) (палітгурток аддзела сувязі — прапагандыст Міразуеў).

Пры падборы прапагандыстаў гарадскі камітэт не праяўляе дастатковай большэвіцкай пільнасці, не вывучае кожнага прапагандыста паасобку. Анкетныя весткі аб тым або іншым прапагандысце лічацца дастатковымі для яго вывучэння. Такая палітычная блізарукасць на практыцы прывяла да таго, што справа комуністычнага выхавання моладзі даручалася асобным ворагам — трацкістам. За апошні час сярод прапагандыстаў комсамольскай сеткі былі выкрыты і выключаны з партыі і комсамола 11 чалавек трацкістаў, аб якіх гарадскі камітэт комсамола даведаўся пасля выключэння іх з партыі. Тав. Чучко і зараз лічыць, што паколькі прапагандыст з'яўляецца комсамольцам і яго ведае гарком, то няма патрэбы займацца яго вывучэннем, як прапагандыста.

Другі пленум ЦК ВЛКСМ падкрэсліў, што прапагандысцкай работай сярод моладзі павінны займацца асабіста сакратары РК, РК. Факты паказваюць, што рашэнне пленума для сакратара менскага гаркома комсамола тав. Фадзеева не з'явілася абавязковым, бо палітычная прапаганда і агітацыя праходзіла міма яго. Там, дзе справа ідзе аб прапагандзе, ён агульнымі разважаннямі аб «поспехах» усялякі імкнецца змазаць сапраўднае становішча палітвучобы на гораду. Тав. Фадзеў не толькі не ведае аб рабоце палітгурткоў на гораду, больш таго, ён не ведае, дзе і як вучацца работнікі апарата гаркома комсамола.

— Хто ў вас кіруе комсамольскімі палітгуртком?

— Не ведаю... Мабыць... тонога і гурткоў у нас няма.

Гэта адказвае загадчык аддзела палітвучобы гаркома комсамола т. Чучко на пытанне сакратара гаркома тав. Фадзеева.

Палітычная агітацыя сярод моладзі — зусім закінуты ўчастак работы. Важнейшыя палітычныя падзеі сярод моладзі не вывучаюцца. Такое «кіраўніцтва» важнейшай справай, справай комуністычнага выхавання моладзі, ні ў якім разе не можа забяспечыць выкананне рашэнняў партыі і X з'езда комсамола ў справе выхавання моладзі.

Кіраўнікі Менскага гарадскога камітэта павінны зразумець, што комуністычнае выхаванне моладзі — вастрэйшая палітычная задача, што комсамол заклікан рыхтаваць змену, адданую сваёй радзіме, партыі, выхоўваць людзей, узброеных марксісцка-ленінска-сталінскай тэорыяй, усебакова развітых, мужных. Гэта справа вельмі адказная і ёй патрэбна любоўна кіраваць.

М. ВАГАНАВА.

Райкомы парушаюць статут партыі

МОЗЫР. (Нар. «Звязды»). 51 параграф статута партыі гаворыць, што «у первічных партыйных камітэтах, якія яднаюць не больш 100 членаў партыі, партыйная работа вядзецца, як правіла, неаслабанёнымі ад работы на вытворчасці работнікамі». Гэты параграф партыйнага статута парушаецца мозырскім і петрыкаўскім райкомамі партыі.

Партарганізацыя фанернага завода «Чырвоны Кастрычнік» (Мозыр) налічвае не больш 20 членаў партыі, але сакратаром парткома гэтай арганізацыі працуе аслабанёны ад работы на вытворчасці Елецкі. Зарплату за партыйную работу ён атрымлівае ў райкоме партыі, як штатны прапагандыст райкома. Гэта практыка праводзіцца райкомам ужо на працягу двух год.

На фанерным заводзе «Звязда», Петрыкаўскага раёна, сакратар парткома Кароль таксама вызвалены ад работы на вытворчасці, хоць партыйная арганізацыя, якой ён кіруе, не перавышае 25 чалавек.

ФРАЛОЎ.

М. ЛЯЎКОЎ

Старшыня ЦК МОПР БССР

ДЗЕНЬ МОПР

66-ю гадавіну Парыжскай Комуны народы вялікага Совецкага Саюза сустракаюць грандыёзнымі перамогамі на фронце соцыялістычнага будаўніцтва. Ва ўсіх кутках нашай вялікай соцыялістычнай радзімы расце культурны і матэрыяльны абабыт мас, мацнее сталінская дружба народаў вялікага Совецкага Саюза. Гераічнымі намаганнямі совецкага народу пад кіраўніцтвам нашай комуністычнай партыі «у нас ўжо ажыццёўлена ў асноўным першая фаза комунізма, соцыялізм» (Сталін).

66-ю гадавіну Парыжскай Комуны, дзень памяці афяр комуны, народы вялікага Совецкага Саюза праводзяць пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі, ярка аллюстраваўшай вялікія правы і свабоды, заваяваныя пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна гераічным совецкім народам.

Сталінская Канстытуцыя пераможнага соцыялізма мае велізарнае сусветна-гістарычнае значэнне нашай эпохі. «Цяпер, калі мутная хваля фашызма аплёўвае соцыялістычны рух рабочага класа і змешвае з грязёй дэмакратычныя імкненні лепшых людзей цывілізаванага свету, новая Канстытуцыя СССР будзе абвінаваўчым актам супроць фашызма, гаворачым аб тым, што соцыялізм і дэмакратыя непераможны. Новая Канстытуцыя СССР будзе маральнай дапамогай і рэальнай палмогай для ўсіх тых, хто вядзе цяпер барацьбу супроць фашысцкага варварства» (І. В. Сталін. Даклад на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў).

Народныя масы ўсяго свету, натхнёныя нашай вялікай Сталінскай Канстытуцыяй і поспехамі нашай Совецкай краіны, вядуць упартую барацьбу з праклятым фашызмам.

Дзень Парыжскай Комуны не толькі дзень памяці афяр комуны, гэта дзень барацьбы, дзень, прысвечаны тым, хто сёння ва ўсім свеце працягвае барацьбу парыжскіх комунараў і пад сцягам алзінага антыфашысцкага народнага фронта змагаецца супроць пагрозы новай сусветнай бойні, якую так упарта рыхтуюць германскія і італьянскія фашысты і японскія імперыялісты з дапамогай сваіх агентаў—заклятых ворагаў народу, рэстаўратараў капіталізма — трацкістска-зіноўеўскіх бандытаў і правых контрэволюцыянераў.

Гераічная барацьба іспанскага народу супроць фашысцкіх мяцежнікаў, германскіх і італьянскіх інтэрвентаў за дэмакратычную рэспубліку мае важнейшае гістарычнае значэнне ў развіцці міжнароднага рэвалюцыйнага руху. У гадавіну памяці афяр Комуны мы шлём сваё палкае прывітанне іспанскаму гераічнаму народу, які змагаецца на перадавых франтах барацьбы за мір, за дэмакратыю, супроць фашызма.

Гераічная абарона Мадрыда, 8 месяцаў барацьбы рэспубліканскай арміі ў Іспаніі, салідарнасць працоўных усяго свету з іспанскім народам, узмацненне пазіцыі народнага фронта ва Францыі — паказваюць, што народныя масы ў пэўным радзе краін поўны баявой рашучасці даць сакрушальны адпор фашысцкаму варварству.

Рэвалюцыйны пролетарыят у сваёй гераічнай барацьбе супроць фашызма, супроць падрыхтоўкі новых імперыялістычных войн, у абарону СССР, нясе незлічоныя афяры. За 11 год—з 1925 па 1935 год — у краінах капітала арыштавана 5.186.070 чал., ранена і збіта — 3.819.609 чал., забіта замучана на смерць — 3.309.521 чал., прыгаворана к смерці — 246.584 чал. і прыгаворана да гурэмнага зняволення і грашовага штрафу 319.593 чал.

Па гэтых няпоўных вестках за 11 год колькасць афяр фашызма і белага тэрору ў краінах капітала, уключаючы каланіяльныя і поўаколаніяльныя краіны, дасягнула жудаснай лічбы — 12 мільёнаў 978.407 чалавек, з іх: забітых і замучаных на смерць зверскімі катаваннямі — 3 млн. 309.521 чал. За 1936 год вынікі яшчэ не падведзены. Па даных той-жа статыстыкі Выканкома МОПР к пачатку 1936 года ў капіталістычных турмах і канцэнтрацыйных лагерах капітала налічваўся 1 млн. 39 тыс. палітзняволеных.

Лепшыя сыны народаў капіталістычных краін пакутуюць у фашысцкіх засценках: Эрнст Тэльман, Мацыас Ракошы, Тойво Антыкайнен, Умберто, Тэрачыні, Грампы, Том Мунні, Луіс Карлос, Престэс, юнак Скотсборо і тысячы іншых вядомых і безімённых герояў рабочага класа і сялянства падвяргаюцца злейшым пакутам у турмах капітала. Сучасныя каты фашысцкіх краін ва многа раз перавысілі катаў Парыжскай Комуны, яны імкнуцца патапіць у крыві нараджаючуюся сусветную комуну. З дня ў дзень расце ў капіталістычных краінах лік афяр фашысцкага тэрору, але гэтыя-ж лічбы паказваюць, што расце лік актыўных барацьбітоў супроць фашызма, за свабоду, за соцыялізм.

Дзень Парыжскай Комуны — гэта дзень пратэсту прапоўных усяго свету супроць белага тэрору буржуазіі, дзень міжнароднай пролетарскай салідарнасці, дзень арганізаванай дапамогі барацьбітам пролетарскай рэвалюцыі. Вось чаму дзень Комуны стаў днём міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі — днём МОПР.

Беларуская арганізацыя МОПР пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і ЦК МОПР СССР прыхоўзіць да 66-й гадавіны Парыжскай Комуны — дня МОПР — з наступнымі паказальнікамі ў сваёй рабоце.

За мінулы 1936 год арганізацыя вырасла на 126 тысяч новых членаў і налічвае зараз у сваіх радах 461 тысячу баявых пролетарскіх інтэрнацыяналістаў. Фінансавы план па аказанню дапамогі палітзняволеным і іх сем'ям выканан за 1936 год на 99,8 проц. Перасланa на годзе 2 пісьмы.

карысць зарубежных барацьбітоў рэвалюцыі 1.006.000 рублёў.

Не менш важная функцыя арганізацыі МОПР — выхаванне шырокіх мас працоўных у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма. Ячэйкі МОПР нашай рэспублікі праводзяць у гэтым напрамку вялікую работу шляхам правядзення інтэрнацыянальных вечароў, гутарак і чытак аб міжнародным становішчы, абсталявання куткоў МОПР і т. д.

Наша арганізацыя мае ў сваіх радах адданых актывістаў, якія з'яўляюцца не толькі добрымі мопраўцамі, але і лепшымі стахановцамі на вытворчасці.

Вось некалькі прыкладаў: тав. Трэйсцер — рабочы-стахановец — з'яўляецца старшынёй ячэйкі МОПР бабруйскага спіртазавода з 1925 г. — дня яе ўтварэння. Членствам МОПР ахоплены ўсе працоўчыя. Сярод членаў ячэйкі сістэматычна праводзіцца інтэрнацыянальна-выхаваўчая работа: інтэрнацыянальныя вечары, гутаркі аб міжнародным становішчы, чыткі пісем, атрыманых ад палітзняволеных, і т. д. На заводзе ёсць мопраўскія ўдарныя брыгады імя Клары Цэткін і імя тав. Ракоўшы. Гэтыя брыгады сістэматычна перавыконваюць свае вытворчыя заданні і з'яўляюцца ўзорам па правядзенню інтэрнацыянальна-масавай работы. За 1936 год ячэйка МОПР спіртазавода перасланa ў карысць палітзняволеных 2105 р.

Тав. Гольдберг — стахановка менскай швейнай фабрыкі імя 8-га сакавіка — працуе старшынёй ячэйкі МОПР. Сваёй актыўнай работай яна змагла прыцягнуць да работы ячэйкі лепшых ударніц і стахановак фабрыкі і дабілася немалых поспехаў.

З агульнай колькасці працуючых на фабрыцы (420 чалавек) 375 з'яўляюцца членамі МОПР. На фабрыцы ёсць 2 ударныя брыгады імя Тэльмана і імя Е. Д. Стасавай. Фінансавы план за 1936 год выканан ячэйкай на 250 проц., сабрана ў карысць палітзняволеных 2309 руб. У падпэфную Лукішскую турму (Вільна) члены МОПР фабрыкі паслалі ў мінулым

Ячэйкі МОПР нашай рэспублікі прымалі актыўны ўдзел у кампаніі дапамогі гераічнаму іспанскаму народу, які пад сцягамі адзінага фронта змагаецца ў нерозуўнай і цяжкай барацьбе супроць германскага і італьянскага фашызма.

Мопраўцы Совецкай Беларусі аказалі вялікую дапамогу інтэрнацыянальнаму дзіцячаму дому імя Стасавай і будаўніцтву 2-га інтэрнацыянальнага дзіцячага дома на ст. Моніна (каля Масквы).

Летам мінулага года група выдатнікаў вучобы інтэрнацыянальнага дзіцячага дома імя Стасавай (тут была і дачка слаўнай іспанскай рэволюцыянеркі Даларэс Ібаруры) адпачывала ў Чонкаўскім (каля Гомеля) санаторным піонерскім лагеры. Вялікімі клопатамі акружылі адпачываючых дзяцей мопраўцы Гомеля.

Сотні падарункаў коштам прыкладна каля 150.000 руб. адправілі ячэйкі МОПР БССР будаўніцтву 2-га інтэрнацыянальнага дзіцячага дома, у якім ужо зараз жывуць дзеці германскіх, іспанскіх, польскіх і іншых рэволюцыянераў.

У ячэйках МОПР сельскагаспадарчых арцелей «Карпачы» Клімавіцкага раёна, «Ударнік» Крычаўскага раёна, «Свабода» Рагачоўскага раёна і ў радзе іншых калгаснікі, добра азнаёміўшыся з жыццёвым шляхам правадыра германскага пролетарыята Эрнста Тэльмана, выбралі яго ганаровым членам сваіх калгасаў. На імя тав. Тэльмана ў калгасах выпісаны працоўныя кніжкі, у якіх налічваецца колькасць працадзён лепшага калгасніка за год, а грашовы і прадуктовы прыбытак ад працадзён перасылаецца на карысць палітзняволеных.

Вялікім штуршком ва ўсёй правядзімай рабоце арганізацыі МОПР БССР паслужыла правядзімае ўсесаюзнае спаборніцтва на права атрымання вышэйшай узнагароды МОПР СССР — прэміі імя Клары Цэткін. Мопраўская арганізацыя Беларусі, якая трымае ўжо 4 гады за пярэнства ў рабоце пераходны чырвоны сцяг ЦК МОПР СССР, актыўна ўключылася ў гэтае спаборніцтва.

Аднак, было-б грубай памылкай не спыніцца і на буйных недахопах, якія ёсць у рабоце нашай арганізацыі. Да гэтага часу, не гледзячы на рад нарэнных прыкладаў, работа арганізацыі МОПР'а у калгасах і саўгасах у цэлым астаецца яшчэ на нізкім узроўні.

Дрэнна ў нас з учотам арганізацыі. Значна адстае яшчэ наша работа ў школах і вышэйшых і сярэдніх навучальных установах.

Як буйны недахоп, неабходна адзначыць і дрэннае выкананне фінансавага плана за студзень і люты гэтага года. За студзень план выканан толькі на 52,8 проц., а за люты — на 58,2 проц. Многія кіраўнікі нашых горрайкомаў МОПР сваёй дрэннай работай зрываюць выкананне фінансавага плана арганізацыі МОПР.

Ад такіх арганізацый, як брагінская (старшыня райкома МОПР Кавалёў), быхаўская (Токер), буда-кашалёўская (Лукомскі), багушэўская (Грахоўскі) ні адной капейкі не паступіла на карысць палітзняволеных за студзень і люты м-цы.

Дрэнна выконваюць свае фінансавыя заданні і нашы буйныя арганізацыі. Так, менская выканала за люты фінансавае заданне толькі на 37,4 проц., бабруйская—на 81,4 проц.

Для ажыўлення ўсёй работы МОПР вялікае значэнне мае добрае правядзенне 66-й гадавіны Парыжскай Комуны.

У дзень памяці парыжскіх комунараў, успамінаючы аб слаўным правадзеніку вялікага Кастрычніка, аб героях 1871 года, прыкладзем усе сілы, каб ліквідаваць усе недахопы ў рабоце МОПР БССР. Усе, як адзін, будзем прапаваць на карысць і росквіт нашай слаўнай радзімы, будзем усямерна павышаць нашу рэволюцыйную пільнасць, бо астаткі подлых трацкістска-зіноўеўскіх бандытаў, правых контрэволюцыянераў, нацыяналісты розных мастцей усякімі сродкамі жадаюць падарваць наша соцыялістычнае будаўніцтва, затрымаць наш рух наперад.

Пад сцягам Леніна — Сталіна, пад кіраўніцтвам нашай вялікай комуністычнай партыі — да новых перамог на ўсіх участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Рэспубліканцы захапілі багатую ваенную здабычу

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 17 сакавіка. (БЕЛТА). Як перадаюць з Мадрыда, італьянскія войскі ўчора зноў адступілі з пазіцый на поўнач ад сялення Трыхуэке, (у 29 клм. на паўночны ўсход ад Гвадалахары), пакінуўшы 20 кулямётаў і 6 грузавікоў з харчаваннем і боепрыпасамі. Захвачан у палон 71 італьянец. Агульны лік італьянскіх палонных дасягнуў 200.

Некалькі карэспандэнтаў гутарылі з італьянцамі. Многія з іх скарджаліся на тое, што хоць італьянскі ўрад абяцаў плаціць іх сваякам 20 лір у дзень, аднак сваякі нічога не атрымалі.

Італьянцы адзеты ў лёгкае абмундзіраванне, якое не падыходзіць для халоднага горнага раёна, дзе адбываюцца баі.

Іспанскі міністр асветы Эрнандэс заявіў палонным: «Вы цяпер сярод братоў рабочых, а не сярод ворагаў. Мы нічога не маем супроць вас—афіяр фашысцкіх кіраўнікоў».

Учора 20 рэспубліканскіх бамбардыроўшчыкаў узмоцнена бамбардыравалі Брыуэгу (у раёна Гвадалахары). Было скінута 760 бомб. У тым-жа раёне 35 рэспубліканскіх знішчальнікаў абстрэльвалі з кулямётаў скапленні войск мяцежнікаў. У часе паветранага бою было збіта 4 самалёты мяцежнікаў і адзін рэспубліканскі.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 16 сакавіка. (БЕЛТА). Згодна вестак з Мадрыда, рэспубліканскія войскі, спыніўшы наступленне мяцежнікаў на Гвадалахару і знішчыўшы шмат танкаў мяцежнікаў, перайшлі ў контратаку, якая паспяхова працягваецца. У апошніх баях на поўнач ад Гвадалахары рэспубліканцы захапілі звыш 100 кулямётаў, гарматы, танкі італьянскай вытворчасці і шмат грузавікоў, адзін з якіх быў нагружан бомбамі са слезатачывым газам.

Італьянскія войскі за апошнія тры дні страцілі 1.500 чалавек забітымі і раненымі.

***

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 16 сакавіка. (БЕЛТА). 14 сакавіка ў баях на гвадалахарскім фронце (на паўночны ўсход ад Мадрыда) ўрадавымі войскамі занят хутар за 3 кілометры ад Брыуэга. Захвачана звыш 100 палонных італьянцаў, 18 кулямётаў і пяць проціватанкавых гармат. Выведзена са строю адна палявая гармата. Атака мяцежнікаў каля Сіфуэнтэ адбіта. Увесь дзень рэспубліканская авіяцыя бамбардыравала праціўніка. Два самалёты «Фіят» збіты, адзін «Фокер» папярпеў аварыю. Праціўнік панёс вялікія страты.

Баі на рацэ Харама (на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) прадаўжаюцца. Уведзеныя ў бой германскія танкі былі жорстка атакованы ўрадавымі войскамі. Згодна заяў перабежчыкаў, усё ўзбраенне мяцежнікаў, якія дзейнічаюць на гэтым фронце, — германскага паходжання.

На фронце Кардовы (горад на поўдні Іспаніі) ўжо на працягу дзевяці дзён ідуць ярасныя баі. Урадавыя войскі ўпарта абараняюць свае пазіцыі. У ноч з 13 на 14 сакавіка мяцежнікі тры разы атакавалі рэспубліканцаў, але кожны раз адступалі з вялікімі стратамі.

ЗАЯВА АЛЬВАРЭСА ДЭЛЬ ВАЙО

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 16 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Фабра паведамляе: «Адказваючы на пытанне замежных карэспандэнтаў адносна намераў іспанскага ўрада у сувязі з апошняй нотай, адрасаванай Лізе нацый, іспанскі міністр замежных спраў Альварэс дэль Вайо, заявіў:

«У канцы 1936 г. Іспанія, грунтуючыся на арт. 11 статута Лігі нацый патрэбавала склікання Совета Лігі. Іспанія з'явілася тады ў Жэневу зусім не для таго каб прад'явіць якое-небудзь патрабаванне, якое цікавіць адну Іспанію, але для таго, каб сігналізаваць аб становішчы рэчаў, якое прадстаўляе сур'ёзную пагрозу справе ўсеагульнага міру.

Пасланай мною нотай мелася на ўвазе інфармаваць генеральнага сакратара Лігі нацый і праз яго ўсіх членаў Лігі, а значыць і Совет, аб становішчы, якое стварылася ў рэзультаце адпраўкі ў Іспанію рэгулярных часцей італьянскай армії для ўдзелу ў баях на тэрыторыі дзяржавы, якая з'яўляецца членам Лігі нацый. Гэта прадстаўляе сабой, з пункту гледжання арт. 10 статута Лігі нацый, самае цяжкае парушэнне асноўных палажэнняў Лігі нацый, дапушчанае на еўрапейскім кантыненце, з часу стварэння Лігі.

У сучасны момант Іспанскі ўрад можа толькі чакаць, як будуць рэагаваць на падобнага роду выкрыцці тыя, у чыю задачу ўваходзіць нагляд за выкананнем статута Лігі нацый».

Што-ж датычыць ноты, пасланай англійскаму ўраду, які з'яўляўся да гэтага часу рупарам камітэта па неўмяшанню, то Альварэс дэль Вайо выказаў надзею, што пытанне, пастаўленае ў гэтай ноце, будзе тэрмінова разгледжана з прычыны выключнай сур'ёзнасці стварыўшагася становішча.

— Я спадзяюся таксама,—заявіў дэль Вайо,—што камітэт па неўмяшанню выкажацца ў той або іншай форме ў бліжэйшыя дні, каб іспанскі ўрад ведаў, якую яму заняць пазіцыю.

ФАШЫСЦКАЯ ПРАВАКАЦЫЯ У ПАРЫЖЫ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 17 сакавіка. (БЕЛТА). Учора вечарам у рабочым квартале Клішы адбылася крывавапралітная сутычка паміж паліцыяй і 10-тысячнай антыфашысцкай дэманстрацыяй пратэсту супроць рашэння міністра ўнутраных спраў і прэфекта паліцыі дазволіць фашысцкай партыі Дэ ля-Рока («французская социяльная партыя») наладзіць сход у кіно, у самым цэнтры раёна побач з муніцыпальным саветам. Улады далі магчымасць 500 фашыстам забарыкадавацца ў кіно, а затым акружылі будынак кіно моцнымі нарадамі коннай і пешай паліцыі і жандармерыі.

К вечару сабралася велізарная дэманстрацыя. Паліцыя некалькі раз нападала на дэманстрантаў. У адказ дэманстранты закідалі паліцэйскіх каменнямі, кавалкамі чыгуну і т. п. Паліцыя адкрыла стральбу. У выніку некалькі чалавек было забіта і звыш 200 ранена. Сярод раненых — Блюмень — начальнік габінета старшыні совета міністраў, які прыбыў разам з міністрам унутраных спраў у гэты раён. Ранен таксама сакратар сенскай федэрацыі социялістычнай партыі Дзюпон. У сутычках з дэманстрантамі ранена не менш 70 паліцэйскіх.

Каля 12 гадзін ночы на месца падзей прыбылі старшыня савета міністраў Блюм і генеральны сакратар компартыі Торэз, якія наведалі раненых у муніцыпальнай больніцы.

Другі сход фашыстаў у Аньер (раён, які знаходзіцца недалёка ад Клішы) таксама быў адзначан крывавымі вынікамі. Фашысты стралялі ў рабочую дэманстрацыю і нападалі на яе з дубінкамі. Адзін рабочы ранен куляй у галаву.

Орган генеральнай канфедэрацыі працы «Пепль» піша: «Для многіх было ясна, што паліцыя мела шэрды намер праваказаць выступленне Ніякага ўгаварвання натоўпу не было. Агонь адкрываўся без малейшага папярэджання.

ВЯЛІКІ АНТЫФАШЫСЦКІ МІТЫНГ У НЬЮ-ЁРКУ

НЬЮ-ЁРК (буйнейшы цэнтр ЗША), 16 сакавіка. (БЕЛТА). Тут адбыўся антыфашысцкі мітынг, у якім прымала ўдзел 25 тысяч чалавек. Прынята рэзалюцыя, якая ганьбуе германскі фашызм, як сур'ёзнейшую пагрозу цывілізацыі, патрабуе абвяшчэння байкота германскім таварам, і выказваецца супроць прадастаўлення Германіі крэдытаў.

На мітынгу выступалі Льюіс (старшыня камітэта вытворчых профсаюзаў), Джонсон (былы глава нацыянальнай адміністрацыі па аднаўленню), Эрыка Ман (дачка пісьменніка Томаса Мана) і інш. Мэр Нью-Ёрка Ла Гардыя заявіў, што сусветная грамадская думка асудзіла фашысцкую Германію.

Льюіс гаварыў аб фашысцкім тэроры ў Германіі, аб знішчэнні германскіх профсаюзаў, аб эксплаатацыі і голадзе працоўных у Германіі. Ён заклікаў амерыканскіх рабочых і фермераў аб'яднацца для барацьбы з фашызмам у ЗША.

У залу, дзе адбываўся мітынг, з'явілася дэлегацыя ў складзе некалькіх сот членаў нямецкіх антыфашысцкіх рабочых клубаў. Яна была сустрэта авацыяй.

Міжнародная хроніка

* У Жэневе (Швейцарыя) у прысутнасці дэлегатаў 20 нацыянальных камітэтаў і 22 міжнародных арганізацый адкрылася пасяджэнне генеральнага совета міжнароднага руху за мір. Іспанію на пасяджэнні прадстаўляе пасол у Бельгіі Осорыо Гальярдо, Францыю — міністр авіяцыі П'ер Кот. У сваёй уступнай прамове старшыня генеральнага совета дэлегат Англіі лорд Сесіль заявіў, што Ліга нацый павінна неадкладна рэагаваць на выкрыцці іспанскага ўрада наконт утаймання італьянскіх і германскіх войск на іспанскую тэрыторыю.

* Французскі ўрад апублікаваў дэкрэт аб адчуджэнні ў карысць дзяржавы ўсіх прадпрыемстваў, цэхаў, мастоў і тэрыторый завода «Шнейдэр-Крэзо», так або інакш звязаных з вытворчасцю для ваенных мэтаў.

* З Будапешта (сталіца Венгрыі) паведамляюць, што венгерскі ўрад датэрмінова распусціў парламент па «вялікодных святы». Гэта, відаць, мае мэтай перашкодзіць выкрыццю падаплёкі няўдаўшагася гітлераўскага путча ў Венгрыі. Адначасова прыняты меры да ўзмацнення цэнзуры друку.

* 16 сакавіка французскі ўрад выпусціў другую частку пазыкі нацыянальнай абароны на 3 мільярды франкаў (100 франкаў — 24 руб.) З заклікам падпісацца на пазыку выступілі па радыё ваенны міністр Даладзье і старшыня палаты дэпутатаў Эрыо.

* У Барселоне (сталіца Каталонскай аўтаномнай вобласці ў Іспаніі) адбылась маніфестацыя 3 тыс. актывістаў аб'яднанай социялістычнай партыі Каталоніі, мабілізаваных у армію. Советнік каталонскага ўрада Камарэра звярнуўся да іх з прамовай, заклікаючы выканаць свой абавязак перад рэспубліканскай Іспаніяй.

* З Берліна (сталіца Германіі) паведамляюць, што міністэрства фінансаў распарадзілася выключыць са звароту ўсе срэбныя манеты поўнай вагі, выпушчаныя да прыходу фашыстаў да ўлады, і замяніць іх манетамі, якія-б змяшчалі значна меншую долю срэбра.

* Агенцтва Рэйтэр паведамляе, што ад разрыву сэрца памёр вядомы англійск. дзяржаўны і палітычны дзеяч, былы міністр замежных спраў Осцін Чэмберлен.

* У Нанкін (сталіца Кітая) прыбыла японская эканамічная місія. Разам з ёю прыбыў японскі ваенны аташэ ў Кітаі генерал Кіта. Кітайскі друк адзначае, што місія складаецца з найбольш уплывовых прадстаўнікоў японскага дзелавога свету. Кітайскія газеты выказваюць сумненне ў магчымасці сапраўднага эканамічнага супрацоўніцтва паміж Кітаем і Японіяй.

* Венскія газеты паведамляюць з Мюнхена (Германія), што ў апошнія дні Гестапо (германская тайная паліцыя) зрабіла масавыя арышты сярод апазіцыйных элементаў. Турмы настолькі перапоўнены, што зняволеныя карыстаюцца месцамі для сну толькі па чарзе.

ЯК Я ВЫРАТАВАЎ УТАПАЮЧАГА

РАСКАЗ ВАРТАЎНІКА МЕНСКАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ МАКСІМА АСТАШЭВІЧА

Двое сутак работнікі пажарнай і вартавой аховы менскай электрастанцыі бязмежна змагаліся з ільдзінамі, не даючы ім зрабіць затор і ўзламаць чыгуначны мост і плаціну. 16 сакавіка к канцу другіх сутак дзяжурства на чыгуначным масту адбыўся няшчасны выпадак. Работнік пажарнай аховы Уладзімір Бразінскі імкнуўся пяшнёй прапіхнуць пад мост вялікую ільдзіну. Моцным цячэннем вады ільдзіну адразу рванула пад мост, а разам з ёй сцягнула і Бразінскага. Вынурнуўшага з-пад вады метраў за 5 па другі бок маста Бразінскага панясло цячэннем да плаціны.

— Я ўбачыў з плаціны плывучага ся род бурлівай рэчкі чалавека, — пачынае свой расказ вартаўнік электрастанцыі Максім Асташэвіч. — Адна думка была ў маёй галаве — выратаваць утапаючага. Бегучы берагам рэчкі, я імкнуўся падаць яму багор. Але дарэмна. Багром я не мог яго дастань. Тады я скінуў шынель і выратаў кінуцца на дапамогу. У гэты час Бразінскі зачапіўся за дрот, які падтрымлівае электрычны слуп. Маруздіць не прыходзілася, жыццё Бразінскага, як качуць, вісела на валаску. Быстра па дроту я дабіраюся да Бразінскага. Але ў гэты час на нас наскаквае велізарная ільдзіна. Баючыся, каб яна не сарвала Бразінскага, я прытрымліваю яго адной рукой, а другой падымаю дрот і прапускаю ільдзіну.

— Бярыся за маю зопратку рукамі, — гавару я Бразінскаму, — але ён акачанеўшымі рукамі не можа трымацца. У гэты час нам падкінулі вяроўку, якую Бразінскі закруціў сабе на руку. Падтрымліваючы яго і трымаючыся за дрот я выцягнуў з бурлівай рэчкі свайго таварыша.

Максіму Асташэвічу 47 год. З 1917 па 1922 год ён змагаўся са шматлікімі інтэрвентамі за маладую совецкую дзяржаву ў радах чапаеўскай дывізіі. Галы, правезеныя ў Чырвонай Арміі, выхавалі ў яго адвагу і рашучасць.

— У такіх выпадках, — заўважае Асташэвіч, — не трэба бянтэжыцца трэба быць спакойным і валодаць сабой. Асташэвіч расказвае, як на далёкім Усходзе ў часе грамадзянскай вайны ён выратаваў утапаючага свайго камандзіра. І потым паведамляе цікавую дэталь, што Бразінскага ён ратуе ўжо другі раз. Першы раз ён ратаваў яго ў Нёмане ў 1921 годзе.

Н. Н.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА КІРАЎНІКОЎ ДЗІЦЯЧЫХ КУЛЬТУРНЫХ УСТАНОУ

16 сакавіка ў Менску адкрылася ўсебеларуская нарада загатчыкаў дамоў піонераў, піонерскіх клубаў і дамоў калгасных рэбят, скліканая Цэнтральным камітэтам ЛКСМБ і Народным камісарыятам асветы БССР.

Такая нарада праводзіцца ў Беларусі ўпершыню. На ёй прысутнічаюць прадстаўнікі ад 9 дамоў піонераў, ад 13 піонерскіх клубаў, ад дамоў калгасных рэбят, якіх налічваецца ў рэспубліцы каля 30.

На першым пасяджэнні нарады тав. Красоўскі — загатчык дома калгасных рэбят Рудакоўскага сельсовета (Віцебшчына) расказаў аб цікавай і змястоўнай рабоце гэтай культурнай установы.

Дом аб'яднае звыш 400 дзяцей калгаснікаў. У ім працуе многа гурткоў і лабараторый, чытаюцца цікавыя лекцыі.

На гэтым-жа пасяджэнні былі заслуханы даклады загатчыка барысаўскага дома піонераў, клімавіцкага піонерскага клуба і інш.

Адзін дзень работы нарады буйе прысвечаны азнаямленню з работай менскага Палаца піонераў і акцябрат. (БЕЛТА).

МЕНСКУ—УЗОРНЫ ВЕЛАТРЭК

Гэтымі днямі 50 веласіпедыстаў Менска звярнуліся з адкрытым пісьмом да старшыні Менскага гарадскога совета тав Жуковіча, ў якім патрабуюць пабудовы новага велатрэка ў Менску.

Веласіпедны спорт у БССР з'яўляецца самым адсталым відам фізкультуры. Не гледзячы на тое, што ў Менску ёсць каля 8.000 веласіпедыстаў, горад не мае тэхнічна правільнага велатрэка. Трэк на Усебеларускім стадыёне — пабудован з драва і вялікага размеру — 666 метраў. Лепшыя трэкі Саюза пабудаваны з асфальта і размерам 500 метраў. Апрача ўсяго, менскі трэк прыпоў у нягоднасць, за ім трэніравацца небяспечна, бо дошкі ўсе згнілі. У мінулым годзе быў рад няшчасных выпадкаў з лепшымі гоншчыкамі рэспублікі.

У садзе «Профінтэрн» быў некалі асфальтавы трэк. Калі яго добра адрамантаваць, спланіраваць віражы, асфальтаваць яго, пабудаваць павільён для раздзявалак, душаў, памяшканне для хавання веласіпеднага інвентару, веласпартсмены сталіцы БССР атрымаюць базу для майстэрскага авалодання спартыўнай тэхнікай.

І. ЦЫВЕС.

А. Ф. ШЭЎКО

Ваўчасна памёр адзін з слаўных стаханаўцаў сплава, імя якога вядома далёка за межамі Беларусі — Арцём Фёдаравіч Шэўко — сплаўшчык Прыпяцкай сплаўканторы.

Арцём Фёдаравіч — сын батрака, нарадзіўся ў 1888 годзе ў в. Вяседкі Мазырскага ўезда, Менскай губерні.

У 1918 годзе т. Шэўко ўступае ў славуты мазырскі полк Чырвонай Арміі і прымае актыўны ўдзел у барацьбе супроць белапольскіх банд. У 1923 годзе ён зварочваецца з арміі і з гэтага часу — 14 год — без перапынку працуе на сплаве.

У 1936 годзе ён першы ўзнімае сцяг стаханаўскага руху на сплаве, даводзіць выпрацоўку аднаго вязчыка да 62,5 кубаметра ў дзень замест нормы ў 10.

Ініцыятар усесаюзнага спаборніцтва сплаўшчыкаў у 1936 годзе, тав. Шэўко ўзначальвае брыгаду социялістычнай дапамогі сплаўшчыкам Калінінскай вобласці. Пад яго кіраўніцтвам брыгада выпрацоўвала 520 проц. за дзень.

Яго работа і адданасць справе социялістычнага будаўніцтва будуць служыць прыкладам для ўсіх работнікаў сплава.

РЭСІН, ЮДОВІЧ, ТКАЧУК, ЗАРАНКІН, ТРЫБУШЭЎСКІ, НОВІКАЎ, БУШКО, БЕРХЕН, ПЕРСІЦКІ, КАРОЛЬ, ГЕЙШТЭР, ФРЭНКЕЛЬ, ЧЭПЕЛКІН, ІЎРЫ.

ГІСТОРЫЯ СОЎГАСАЎ

Для ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў радзе свінасоўгасаў БССР пішуць гісторыі сваіх соўгасаў. У соўгасе «Культура» Чавускага раёна створана рэдакцыйная калегія ў складзе дырэктара тав. Арцюха, заатэхніка Озерскага і агранома Дземенцева. Да ўдзелу ў складанні гісторыі прыцягнуты стахановцы: трактарыст Пахомаў, цялятніца Капанэвіч і інш. Прыступілі да збору матэрыялаў і створаны рэдакцыйныя калегіі ў соўгасах «Перамога» Мсціслаўскага раёна, «Індустрыя» Пухавіцкага раёна, імя Свердлова Дзержынскага раёна і інш. Гісторыі соўгасаў аллюструюць узнікненне данага соўгаса, яго рост за 20 год Кастрычніка, паказ лепшых людзей, культуры і быту.

ЗАЦВІЛІ БЭЗ І ЛАНДЫШ

У аранжарэях менскага гарадскога трэста зялёнага будаўніцтва — вясна ў поўным разгары. 10 сакавіка пачалі распускацца кветкі белага махрыстага бэзу. Зараз яны ў поўным цвіценні. Амаль адначасова зацвілі ландышы, лакфіоль, цынэралій і інш. Расцвіўшыя кветкі дастаўляюцца ў магазіны для продажу.

РЭКОРДЫ ПЛАЎЦОЎ БВА

На адбыўшыхся водных спаборніцтвах у басейне менскага Дома Чырвонай Арміі ўдзельнікамі акругавага збору плаўцоў БВА устаноўлена 15 новых рэкордаў акругі. Усе яны значна перавышаюць усебеларускія рэкорды.

6 дасягненняў, устаноўленых на спаборніцтвах, вышэй афіцыйных рэкордаў Чырвонай Арміі.

Кандрацьеў 500 метраў стылем «брас» плыў 8 мінут 12,5 секунды. Гэта на 28,2 секунды вышэй рэкорда РСЧА Капусціну ўдалося на 10,2 секунды палепшыць рэкорд РСЧА у заплыве на 500 метраў вольным стылем. Новае дасягненне, устаноўленае ім, — 6 мінут 35,6 секунды.

Тав. Верата, устанавіўшая рэкорд у нырэнні на 25 метраў (21 сек.), дабілася яшчэ аднаго дасягнення — 400 метраў на спіне пройдзена ёю за 7 мінут 27,6 секунды.

Каманда ў складзе Берлікава, Носава, Дзяканава і Лунёва эстафету 4 па 50 метраў закончылі ў рэкордны час — 2 мінуты 12,8 секунды. Сямёнаў, нырэнчы на 25 метраў, паказаў рэзультат, перавышаючы рэкорд РСЧА. У яго час 14,4 секунды.

ТУРСКІ.

ШАЙКА ЗЛОДЗЕЯЎ НА МЯСАКАМБІНАЦЕ

Крымінальны вышук БССР ускрыў буйныя раскрадванні на менскім Мясакамбінаце. Група работнікаў камбіната сістэматычна крала мяса, каўбасу і збывала гэту прадукцыю праз загатчыкаў магазінамі Менхарчгандля.

Па справе арыштаван 21 чалавек — работнікі Мясакамбіната і магазінаў Менхарчгандля. Вядзецца следства.

ВАДА Ў СВІСЛАЧЫ ПАЙШЛА НА СПАД

16 сакавіка на рацэ Свіслач прайшоў першы грэбень (найвышэйшы ўзровень вады) веснавога разводдзя. У 16 гадзін 30 мінут узровень вады дасягнуў 423 сантыметры (на 248 сантыметры вышэй сярэдне-гадавога ўзроўню вады). Гэта вышыня пратрымалася да 16 гадзін дня. З 17 гадзін пачаўся спад вады. Узровень паніжаўся з хуткасцю 1—2 сантыметры ў гадзіну. У 11 гадзін дня 17 сакавіка вада панізілася да 369 сантыметраў. З 12 гадзін зноў пачалося павышэнне ўзроўню на 2 сантыметры, а ў 14 гадзін дня зноў вада пайшла на спад.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Беларускі інстытут удасканалення ўрачоў
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ЎРАЧОЎ І РАЙЗДРАВАЎ АБ АРГАНІЗАЦЫІ Ў г. МЕНСКУ
наступных КУРСАЎ
УДАСКАНАЛЕННЯ І СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ:
1. Трохмесячныя КУРСЫ (удасканалення і спецыялізацыі) па РЭНТГЕНАЛОГІІ з 5 красавіка.
2. Трохмесячныя КУРСЫ (спецыялізацыі і ўдасканалення) па БАКТЭРЫЯЛОГІІ з 10 красавіка.
3. Трохмесячныя КУРСЫ (удасканалення і спецыялізацыі) па АКУШЭРСТВУ-ГІНЕКАЛОГІІ ў верасні месяцы.
4. Трохмесячныя КУРСЫ (удасканалення і спецыялізацыі) па ХІРУРГІІ ў г. ВІЦЕБСКУ з 10 кр. сакавіка.
Урачы раёнаў, якія маюць права на камандыроўку (трохгадовы перыферычны стаж) і жадаюць спецыялізавацца і ўдасканальвацца па вышэйпералічаных галінах медыцыны, павінны прысылаць праз РАЙЗДРАВЫ заявы аб залічэнні іх на гэтыя курсы.
Заявы ў інстытут павінны паступіць па рэнтгеналогіі, хірургічнаму і бактэрыялагічнаму цыклах не пазней 1 красавіка.
Урачы забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй а таксама за імі поўнасцю захоўваецца зарплата.
Дырэктар інстытута ўдасканалення ўрачоў дацэнт ДАБРУСКІН.

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
Ад 19 сакавіка
ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЦІ БЕЛДЗЯРЖКІНО
ШУКАЛЬНІКІ ШЧАСЦЯ
Рэжысер — заслуж. дзеяч мас. мастацтваў В. КОРШ.
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ: народная артыстка рэспублікі БЛЮМЕНТАЛЬ-ТАМАРЫНА, заслуж. артыст рэспублікі ЗУСКІН і арт. Л. ШМІДТ, Н. ВАЛЬЯНО і КАРЭЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА
Абанемент № 60.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
БОЙТРЭ
Абан. № 4

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДАРЫКО

Дзіцячы гукавы кінатэатр
ЮНАЦТВА ПАЭТА

Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Гукавы кінатэатр «Партак»
«КАЗНЬ»

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 18 САКАВІКА:

16. — пісьмо працоўных Совецкай Грузіі правадыру народаў вялікаму Сталіну. 17 — перадача для дзяцей 17-35 — «Апошнія паведамленні» 18-30— завочная партвучоба. 20-15 — беларускія танцы і песні 21-45 — перадача на польскай мове 21-15 — сімфанічны канцэрт. 22. — перадача на беларускай мове. 23. — «Апошнія паведамленні» 23-15 — перадача на польскай мове.

ЛЕКТОРЫЙ ПРЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ ДОМЕ ГЭХНІКІ (Комсамольская, 25) 18 сакавіка ЛЕКЦЫЯ: «ЗАВАЯВАННЕ СТРАТАСФЕРЫ І МІЖПЛАНЕТНЫЯ ПАДАРОЖЖЫ». Лектар Маскоўскага планетарыя т. ПАЛЯКОЎ. Пачатак у 7 гадзін 30 мінут вечара.

УСЕ НА ВЫСТАЎКУ! УСЕ НА ВЫСТАЎКУ!
З 12 САКАВІКА вул. Кірава, 12
БЕЛШВЕЙТРЭСТАМ
БШТ БЕЛАРУСКІ ШВЕЙТРЭСТ
У КЛУБЕ МЕТАЛІСТАЎ, (радзіла з отдзяленая „ДЫНАМА.")
АДКРЫТА
—ВЫСТАУКА—
МАДЭЛЯЎ ФАСОНАЎ ШВЕЙНЫХ ВЫРАБАЎ | МУЖЧЫНСКАГА, ЖАНОЧАГА І ДЗІЦЯЧАГА АСАРТЫМЕНТУ
ДЛЯ ЗАЦВЕРДЖАННЯ НА АСЕННЕ-ЗІМОВЫ СЕЗОН 2-га ПАЎГОДДЗЯ 1937 г.
ВЫСТАЎКА АДКРЫТА ШТОДЗЕННА ДА 21 САКАВІКА г. г. З 11 гадзін РАНІЦЫ да 11 гадзін ВЕЧАРА.
ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуюць ЭКСКУРСАВОДЫ | ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуе ВЕШАЛКА. УВАХОД ВОЛЬНЫ.
БЕЛШВЕЙТРЭСТ.

НКА РСФСР
ЦЭНТРАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ ЗАМЕЖНЫМ МОВАМ ІН-ЯЗ
ПРЫЁМ НА АДДЗЯЛЕННІ АНГЛІЙСКАЙ І НЯМЕЦКАЙ МОВАЎ
Курс агульны і спецыяльны. Падрыхтоўка і перападрыхтоўка перакладчыкаў.
ПРЫЁМ НА ФРАНЦУЗСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ З 1 МАЯ 1937 года.
Праспект высылаецца за 50 кап. паштовымі маркамі
Москва, Кузнецкай мост, 8.

ПАТРЭБНЫ ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.
Зварачацца Совецкая. 63. 2-гі паверх, выдавецтва «Звязда».

Преконсолб
является одним из лучших химических средств для ПРЕДУПРЕЖДЕНИЯ БЕРЕМЕННОСТИ
РЕКОМЕНДОВАН ЦЕНТР. НАУЧНЫМ КОМИТЕТОМ НКЗ ДИВА ПО БОРЬБЕ С АБОРТАМИ
1-я ФАБРИКА ПРОФИЛАКТИЧЕСКИХ ПРЕПАРАТОВ ВХФ НКЗДРАВА СССР
ПРОДАЖА ВО ВСЕХ АПТЕКАХ И МАГАЗИНАХ САНГИГИЕНЫ
В СЛУЧАЕ ОТСУТСТВИЯ НА МЕСТАХ СООБЩАЙТЕ СОЮЗХИМФАРМТОРГУ МОСКВА, УЛ. ГОРЬКОГО, 15

ВГУБЛЕНЫЯ І ЎКРАДЗЕНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ЛІЧЫЦЬ НЕСПРАЎДНЫМІ:

Голтэр С. Д. — пасведчанне асобы; Рыбакоў І. А. — пропуск на пошту; Трухановіч В. П. — ваенны білет. Хадынскі П. — пашпарт. Лях М. А. — пашпарт; Жэрко І. Е. — пашпарт. Волкава Я. Я. — метрычны выпіс; Жыжнеўскі Т. В. — ваенны білет; Сергееў М. І. — пашпарт; Каранеўскі Н. Е. — ваенны білет; Станішэўскі М. Г. — ваенны білет; Кірылава Л. Д. — прафбілет; Нарэйко С. В. — ваенны білет; Страх А. А. — пашпарт. Петліцкі Г. С — ваенны білет; Міньковіч І. Р — пашпарт; Макарэвіч С. В. — пашпарт; Кузнянова Л. І. — пашпарт. Чарнецкая М. М. — пасведчанне асобы; Пенькоўскі Б. Н. — комсамольскі білет. Шыгорын А. Н. — права шофера і прафбілет, Мамончык А. Д. — пашпарт № 169608. Петрачэнка І. Н. — атэстат аб сканчэнні віцебскага педінстытута; Запольскі С. Ф. — пашпарт. Запольская Я. С. — метрыка. Хробат В. В. — ваенны білет, Хасіневіч Е. З. — пашпарт. Радзько А. В. — пашпарт № 055403, ваенны білет, прафбілет № 206656; Васковіч Ф. Л. — комсамольскі білет. Міхалевіч М. С. — пашпарт і прафбілет; Пуцейко Н. К. — пашпарт на дровы Рачыцкі А. Г. — пашпарт і ваенны білет. Рачыцкая М. А. — метрыка; Хазанава С. В. — квітанцыя камісійнага магазіна № 5236,

29 САКАВІКА ў 7 гадзін вечара на адкрытым пасяджэнні вучонага совета Беларускага сельскагаспадарчага інстытута АДБУДЗЕЦЦА
АБАРОНА кандыдацкай ДЫСЕРТАЦЫІ
аспірантам кафедры механізацыі і электрафікацыі сельскай гаспадаркі В. Н. КАПУЦІНЫМ НА ТЭМУ:
«ДАСЛЕДВАННЕ РАБОТЫ ПАЎДНЕВЫХ І ПАЎНОЧНЫХ КАМБАЙНАЎ У БССР».
Афіцыйныя апаненты член-карэспандэнт Беларускай акадэміі навук, прафесар Ю. А. БЕЙС і дацэнт К. Г. ЛУГАЎСКОЙ.

ДА ЎВАГІ ПАКУПНІКОЎ!
БЕЛБРОДТРЭСТ
— НАРКАМХАРЧПРОМА БССР —
на гэту вул. КОМСАМОЛЬСКАЙ І НЯМІГІ, д. № 1/13
АДКРЫТ УЗОРНЫ МАГАЗІН
ПА ПРОДАЖУ
ГАЗІРАВАНЫХ ФРУКТОВА-ЯГАДНЫХ НАПІТКАЎ, СОКАЎ, ПЛОДА-ЯГАДНЫХ ВІН, ДЖЭМА, ДРОЖДЖАЎ, ПІВА і інш. прадукцыі заводаў трэста
В МАГАЗІНЕ ЗАЎСЕДЫ ЕСЦЬ
ВЯЛІКІ ВЫБАР
РОЗНАСТАЙНЫХ ПА СМАКУ ВЫСОКАЯКАСНЫХ НАТУРАЛЬНЫХ СІРОПАЎ.
НАТУРАЛЬНЫЯ СІРОПЫ, з насычанай газіраванай вадой даюць напітак ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ.
БЕЛБРОДТРЭСТ.

Уп. Галоўлітбела № К—592 Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 63. К. К. С.